Першыя два дні пяцідзеньніка не далі патрэбнага пералому у ходзе сяўбы

Пролетарыі ўсіх краінаў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гарадскому Камітэту Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 261 4166)
ПЯТНІЦА, 25 верасьня 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

Выканаць плян асеньня-зімовых перавозак

Чыгуначны транспарт уступіў у паласу асеньня-зімовых перавозак. Разам з павялічэньнем транзітных перавозак, наладжваюцца ўнутраныя перавозкі па СССР (тарфяніна, бульба і інш.) Узмацненьне перавозак супадае з наступленьнем кліматычных зьмен, што патрабуе ад чыгуначных раёнаў, гаспадарнікаў, партыйных і прафсаюзных арганізацый асаблівай арганізаванасьці ў кіраўніцтве, паваротлівасьці і выразнасьці ў рабоце.

Для таго, каб з посьпехам правесьці асеньня-зімовыя перавозкі трэба паскорыць абарот вагонаў, скараціць да мінімуму прастой пад пагрузкай і выгрузкай.

Партыйныя, прафсаюзныя і ўсе грамадзкія арганізацыі чыгункі зараз трымаюць палітычны экзамэн. Асеньня-зімовыя перавозкі—гэта скразная праверка таго, наколькі ўсьвядомлены дырэктывы ЦК і СНК аб задачах транспарту, наколькі партыйныя арганізацыі і гаспадарнікі змагалі кожны пункт гістарычнай ухвалы зрабіць справай штодзённай работы і барацьбы ўсіх вытворчых зьяднаньняў і кожнага рабочага і служачага.

Па-баявому рэалізуючы дырэктывы партыі, выкарыстоўваючы вокшт перадавых транспартных вучасткаў, трэба зараз пастаўіць работу так, каб галоўны паток асеньня-зімовых перавозак сустрэць на ўсеўзбраеньні.

Зараз патрабуецца асаблівая дакладнасьць у расстаноўцы сіл, зладжанасьць і правільнае ўзаемадзеяньне ўсіх вучасткаў чыгуначнага транспарту.

Выключную ўвагу трэба аддаць пытаньню абороту вагонаў. На толькі работнікі чыгункі, але кожны гаспадарнік, кожны рабочы прадпрыемства павінен змагацца, каб вагоны не прастойвалі, хутчэй выгружаліся, каб рухомы склад выкарыстоўваўся з найбольшай эфэктыўнасьцю.

Рабочыя рэмонтных майстэрань павінны высока ўзьнесьці тэмпы работы, дабіцца найлепшых якасных паказальнікаў, да мінімуму скараціць прастоі.

Ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду аб увядзеньні спаранай яды далоўжа станоўчыя вынікі. Па цэлым радзе раёнаў значна зьнізан процант хворых паравозаў, рацыянальна скарыстоўваецца мыла, зьнішчаны элемэнты расхлябанасьці.

Аднак, ня ўсе яшчэ партарганізацыі, ня ўсе гаспадарнікі зразумелі палітычную важнасьць увядзеньня спаранай. У наўчэнасьці цэлы рад вышадкаў зрыву спаранай яды з прычыны ігнараваньня гэтага мерапрыемства паасобнымі кіраўнікамі і партыйнымі арганізацыямі.

Недацэнка спаранай у злучэньні з формальнай перабудовай масавай работы, са слабасьцю партработы ў групе, у брыгадзе вядуць да павялічэньня процанту хворых паравозаў. Так на Віцебскім раёне (замест заданых 18 проц.) захварэлі процант хворых паравозаў даходзіў 23, а за першую дэкаду верасьня—25,13 проц.

С пачаткам асеньніх перавозак павялічылася колькасьць здарэньняў амаль па ўсіх раёнах. Гэта трывожны сыгнал. Партарганізацыі, прафсаюзы павінны ў найкарацейшы тэрмін дабіцца сапраўднага, а не фармальнай перабудовы масавай работы, перанёсьці цэнтр яе цяжару, як і цэнтр цяжару партработы, у групу, брыгаду.

Неабходна стварыць атмасфэру нецярпімасьці да аматараў работы па-старымцы, да расхлябанасьці і разгільдзяйства, да канкрэтных вінаватых псаваньня паравозаў, вагонаў, зрывоў спаранай яды і прастояў.

Задачы, якія зараз стаяць перад чыгуначным транспартам, патрабуюць павышэньня прадукцыйнасьці працы ва ўсіх зьвяньнях і на ўсіх вучастках гэтай галіны народнай гаспадаркі. Дабіцца гэтага можна толькі тады, калі адміністрацыя, партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі праявяць патрэбную зьяднаную і кожнага рабочага і служачага.

Па-баявому рэалізуючы дырэктывы партыі, выкарыстоўваючы вокшт перадавых транспартных вучасткаў, трэба зараз пастаўіць работу так, каб галоўны паток асеньня-зімовых перавозак сустрэць на ўсеўзбраеньні.

Зараз патрабуецца асаблівая дакладнасьць у расстаноўцы сіл, зладжанасьць і правільнае ўзаемадзеяньне ўсіх вучасткаў чыгуначнага транспарту.

Выключную ўвагу трэба аддаць пытаньню абороту вагонаў. На толькі работнікі чыгункі, але кожны гаспадарнік, кожны рабочы прадпрыемства павінен змагацца, каб вагоны не прастойвалі, хутчэй выгружаліся, каб рухомы склад выкарыстоўваўся з найбольшай эфэктыўнасьцю.

Рабочыя рэмонтных майстэрань павінны высока ўзьнесьці тэмпы работы, дабіцца найлепшых якасных паказальнікаў, да мінімуму скараціць прастоі.

Ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду аб увядзеньні спаранай яды далоўжа станоўчыя вынікі. Па цэлым радзе раёнаў значна зьнізан процант хворых паравозаў, рацыянальна скарыстоўваецца мыла, зьнішчаны элемэнты расхлябанасьці.

Аднак, ня ўсе яшчэ партарганізацыі, ня ўсе гаспадарнікі зразумелі палітычную важнасьць увядзеньня спаранай. У наўчэнасьці цэлы рад вышадкаў зрыву спаранай яды з прычыны ігнараваньня гэтага мерапрыемства паасобнымі кіраўнікамі і партыйнымі арганізацыямі.

Недацэнка спаранай у злучэньні з формальнай перабудовай масавай работы, са слабасьцю партработы ў групе, у брыгадзе вядуць да павялічэньня процанту хворых паравозаў. Так на Віцебскім раёне (замест заданых 18 проц.) за

Сяўбу азімых і зяблева скончыць у бліжэйшыя дні

Апошняя зводка дала вельмі нязначны прырост у выкананьні пляну сяўбы азімых. Першыя 2 дні пяцідзеньніка штурму пасеўнай, якія ўваходзяць у мінулую пяцідзенку, ня далі патрэбнага пералому. На 20 верасьня плян сяўбы па калгасах і аднаасобным сэктары выкананы на 67,7 проц. супроць 52,5 проц. мінулай пяцідзенкі. Такім чынам, прырост за пяцідзенку складае ўсяго 12,2 проц.

Мы яшчэ ня маем вестак аб ходзе сяўбы за апошнія 3 дні пяцідзеньніка. Але даныя паказваюць, што сучасны тэмп сяўбы ні ў якім разе не забясьпечвае выкананьня пляну ў тэрмін.

Конская цягавая сіла ў большасьці калгасаў у сучасны момант ня мае поўнай нагрузкі. Ня гледзячы на гэта, рад калгасаў ганебна адносіцца да скарыстаньня вольнай конскай сілы.

Матар'ялы, якія мы друкуем з Койданаўскага раёну аб калгасах «КАМІНТЭРН» і «КАМУНАР», відавочна гавораць аб апартуністычных адносінах праўленьняў гэтых калгасаў да скарыстаньня конскай цягавай сілы. У гэтых калгасах дазволілі сабе чакаць трактараў з МТС і спакойна пасьвіць коняй. Апартуністычная практыка кіраўнікоў калгасаў яскрава паказвае на недавацэнку палітычнай важнасьці асеньняй пасеўнай. Аналягічныя факты маюць месца і ў іншых раёнах.

Значную долю віны за нерацыянальнае скарыстаньне конскай цягавай сілы трэба ўскласьці і на некаторыя МТС, якія ня прынялі належных мер для мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў калгасаў на правядзеньне сяўбы азімых.

Мы маем рад выпадкаў, калі да гэтага часу яшчэ ня зьнішчаны злачынныя адносіны ряду раённых арганізацый да забясьпячэньня калгасаў насеньнем. Асаблівае адчуваюць недахват насеньня тыя калгасы, дзе быў вялікі няўраджай і гібель азімых. Між тым, некаторыя раённыя арганізацыі на просьбу калгасаў аб забясьпячэньні насеньнем, глядзяць скрозь пальцы (Уваравічы).

У выніку ўсе гэтыя факты тармозяць пасьпяховае правядзеньне пасеўнай.

Побач з гакебным адставаньнем сяўбы азімых мы маем недапушчальныя адносіны да такой важнейшай кампаніі, як зяблева. Плян зяблева на 20 верасьня выкананы усяго на 8,2 проц. супроць 6,9 проц. у мінулай пяцідзенкі. МТС выканалі свой плян на 16,2 проц. 10 МТС яшчэ нават ня прыступілі да ўздыму цаліны (Шклоўская, Слуцкая, Клімавіцкая, Дубровенская, Расонская, Касьцюковіцкая, Аршанская, Магілеўская і Рагачоўская). Гэтыя факты гавораць аб яўным ігнараваньні зяблевай кампаніі рядам МТС, як аднаго з важнейшых сродкаў павышэньня ўраджайнасьці і асабліва аб недавацэнцы значэньня пад'ёму цаліны пад лён.

Апартуністычная бязьдзейнасьць гэтых МТС ставіць пад яўную пагрозу своячасовае правядзеньне весьнавой пасеўнай і асабліва пасеву ільну ў тэрмін.

Асноўнай прычынай слабых тэмпаў зяблевага ворыва трэба лічыць тое, што да гэтага часу ня ўсімі раёнамі, калгасамі і МТС выканана дырэктыва НКЗБ аб перакідцы 80 проц. трактараў і 30 проц. конскай цягі на зяблева. Учора мы паведамлялі аб недапушчальным адставаньні сяўбы і зяблева ва Ўраравіцкім раёне. Уваравіцкія раённыя арганізацыі праявілі злачынныя адносіны да простых дырэктыў цэнтральных арганізацый. Перакідка патрэбнай цягавай сілы на зяблева яшчэ не ажыцьцяўлена. Вынікам гэтага і зьявілася тое, што раён стаіць перад пагрозай зрыву асеньніх кампаній.

Задача раённых арганізацый — неадкладна ліквідаваць усе паказаныя недахопы. Абвясьціць жорсткую барацьбу апартуністам, якія сваёй бязьдзейнасьцю дапамагаюць клясаваму ворагу сарваць правядзеньне асеньняй пасеўнай і зяблева. Неабходна мабілізаваць усю савецкую грамадзкасьць вёскі на выкананьне пастаўленых партыяй і ўрадам задач. Сяўба і зяблева павінны быць скончаны ў бліжэйшыя дні.

Зяблева ігнаруюць

БАБРУЙСК. У Каменскім сельсавеце зяблевае ворыва не пачыналася. З сямі калгасаў ні адзін не паклапаціўся, каб пачаць зяблева, разам з іншымі сельскагаспадарчымі работамі

Ул. Н.



Трактары за работай

Зводка НКЗБ

аб ходзе сяўбы азімых і зяблеве па раёнах БССР на 20-IX 31

НАЗВА РАЁНАЎ	Пасеяна азімых у проц. да пляну	Зяблева ў проц. да пляну	НАЗВА РАЁНАЎ	Пасеяна азімых у проц. да пляну	Зяблева [illegible]
Брагінскі	34,5	10,2	Клічаўскі	48,5	7
Буда-Кашалеўскі	62,1	5,2	Койданаўскі	50,6	14
Бабруйскі	89,2	14,3	Крычаўскі	71,9	[illegible]
Веткаўскі	52,6	5,4	Лагойскі	75,3	[illegible]
Глускі	46,8	12,5	Магілеўскі	69,5	13
Гомельскі	48,6	17,6	Мсьціслаўскі	81,5	9
Жыткавіцкі	34,6	31,6	Менскі	62,1	[illegible]
Жлобінскі	39,3	2,3	Пранойскі	80,5	9
Кармянскі	56,6	2,2	Пухавіцкі	53,0	5
Камарынскі	50,3	4,0	Плешчаніцкі	55,6	6
Ельскі	27,0	2,8	Смалявіцкі	76,0	12
Лоеўскі	51,3	7,9	Талачынскі	65,7	1
Любаньскі	5,6	14,7	Чэрвеньскі	93,2	5
Лельчыцкі	38,0	—	Чаўускі	63,3	
Мазырскі	40,2	19,1	Чэрыкаўскі	67,8	1
Нараўлянскі	75,6	4,2	Шклоўскі	97,0	15
Парыцкі	78,2	5,3	Вуньдзенскі	60,9	14
Пятрыкоўскі	68,8	56,2	Асьвейскі	85,4	13
Рагачоўскі	86,3	2,4	Аршанскі	91,3	8
Рэчыцкі	18,4	0,4	Бешанковіцкі	79,4	
Слуцкі	70,6	7,5	Віцебскі	79,4	0
Старобінскі	73,8	14,7	Вупкацкі	98,4	4
Стара-Дарожскі	48,6	8,0	Гарадоцкі	105,3	
Тураўскі	11,4	10,4	Дубровенскі	91,1	7
Церахаўскі	54,4	2,2	Дрыгінскі	70,3	[illegible]
Чачэрскі	92,7	1,5	Лёзьнянскі	100,2	7
Чырвонапольскі	62,5	2,8	Лепельскі	74,1	5
Чырв.-Слабода.	62,9	21,1	Полацкі	70,4	3
Уваравіцкі	15,6	0,3	Расонскі	98,6	1
Хойніцкі	74,8	9,0	Сураскі	23,7	34
Асіпавіцкі	74,4	4,5	Сеньненскі	65,5	7
Быхаўскі	84,2	14,2	Сіроцінскі	80,8	7
Барысаўскі	59,9	8,8	Чашніцкі	49,5	0
Бялыніцкі	91,3	9,6	Па БССР	67,7	8
Бярэзінскі	70,4	1,8			
Бягомльскі	68,2	0,1			
Горацкі	85,7	3,1			
Заслаўскі	69,0	15,8			
Клімавіцкі	74,9	10,2			
Крупскі	89,5	0,7			
Капыльскі	75,6	38,2			
Касьцюковіцкі	77,6	3,7			

УВАГА: Зводка складзена па 66 пах па становішчы на 20/IX, а па Дрыгінскім, Жлобінскім, Мазырскім, Пухаўскім, Уваравіцкім, Вузьвяненскім, Радоцкім і Чашніцкім на 15/IX і Любаньскім — на 10/IX.

Наркамзем — Пасеўбюро

СЬМІРНОЎ

Дырэктыва партыі ня выканана

Пасеяна 76 проц. пляну, паднята на зяб 9 проц.

КЛІЧАЎ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). На 23-ГА ВЕРАСЬНЯ ЗАСЕЯНА АЗІМЫХ 12.803 ГЭКТАРА—76 ПРОЦ. ПЛЯНУ. КАЛГАСАМІ ЗАСЕЯНА 70 ПРОЦ., САЎГАСАМІ—55 ПРОЦ. І АДНААСОБНІКАМІ — 86 ПРОЦ.

ЗАСІЛАСАВАНА 1.610 ТОН, ШТО СКЛАДАЕ 22 ПРОЦ. УЗАРАНА ЗЯБЛІВА 2.575 ГЭКТАРАЎ—9 ПРОЦ.

ПА РАЁНЕ АБВЕШЧАНЫ ПЯЦІДЗЕНЬНІК ШТУРМУ ПАСЕЎНАЙ.

РАЙПАРТКОМ—ЧАПЕЛКІ.
РАЙВЫКАНКОМ—БАБАРЫКА.

Скончылі сяўбу

Цягавая сіла перакінута на зяблева

КОЙДАНАВА. САЎГАС «ВЯЗЫНЬ-ФАНІПАЛЬ» 18-ГА ВЕРАСЬНЯ СКОНЧЫЎ ПАСЕЎ АЗІМЫХ. ЗАМЕСТ ПЛЯНУ 228 ГЭКТАРАЎ, ЗАСЕЯНА 234. АПРАЧА ГЭТАГА 1 ГЭКТАР ЗАСЕЯН У ФОНД АБАРОНЫ КРАІНЫ.

УСЯ ЎВАГА ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ І РАБОЧАГА КАЛЕКТЫВУ САЎГАСУ ЗАРАЗ СКАНЦЭНТРАВАНА НА ВЫКАНАНЬНІ ПРАГРАМЫ ЗЯБЛІВА, СІЛАСАВАНЬНЯ, УБОРЦЫ ГАРОДНІНЫ І БУЛЬБЫ. З 7 ТРАКТАРАЎ 5 ПРАЦУЮЦЬ ВЫКЛЮЧНА НА ЗЯБЛІВЕ. ЗАКЛАДЗЕНА 1.770 ТОН СІЛАСУ—61 4 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

ДЫРЭКТАР ЛУКАШЭВІЧ.
САКРАТАР СЕЛЬПАРТКОМУ ЗАКС.
СТАРШЫНЯ РАБАЧКОМУ КАМАРДЗІНАЎ.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку"

МТС БССР ПАВІННЫ БЫЦЬ У АВАНГАРДЗЕ ЗАГАТОВАК

МТС выканалі толькі 24 проц. пляну

Машына-трактарныя станцыі БССР павінны былі паказаць першы прыклад ударнага правядзеньня збожжазагатовак. Між тым, даныя аб ходзе гэтай кампаніі па МТС паказваюць недапушчальнае адставаньне апошніх. НА 20 ВЕРАСЬНЯ МАШЫНА-ТРАКТАРНЫЯ СТАНЦЫІ ВЫКАНАЛІ Ў СЯРЭДНІМ 24 ПРОЦ. ГАДАВОГА ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК.

Па радзе МТС процант здачы збожжа яшчэ НІЖЭЙШЫ. Так, АРШАНСКАЯ МТС здала 3,6 проц. заданьня, МЕНСКАЯ — 11,2 проц., ГАРАДОЦКАЯ — 3,6 проц., КОЙДАНАЎСКАЯ — 13,8 проц., ЗАСЛАЎСКАЯ — 12,6 проц., СІРОЦІНСКАЯ — 15,1 проц. і г. д.

Уперадзе ідуць ЛЕПЕЛЬСКАЯ МТС, якая выканала гадавы плян на 64,3 проц., ШКЛОЎСКАЯ — 66,7 проц., ЦЕРАХАЎСКАЯ — 64.8 проц., ТАНЕЖЫЦКАЯ — 51,6 проц. ЖЫТКАВІЦКАЯ — 45,2 проц.

Недапушчальнае адставаньне МТС у збожжазагатоўчай кампаніі тлумачыцца ў першую чаргу слабым ходам абмалоту збожжавых і бабовых культур. На 20 верасьня плян абмалоту выкананы толькі на 27,6 проц

Патрэбен карэнны перапом. МТС абавязаны неадкладна ўзмацніць тэмпы абмалоту і выйсьці на перадавыя пазыцыі збожжазагатовак. Да 1-га кастрычніка МТС павінны дабіцца выкананьня ня менш 50 проц. гадавога пляну збожжазагатовак.

Калгасы Шклоўшчыны ўзмацняюць тэмпы збожжазагатовак

ШКЛОЎ. (Па тэлефону ад наш. кар.). Калгасьнікі і аднаасобнікі Шклоўшчыны 20 верасьня арганізавалі вялікі чырвоны абоз з 1.000 фурманак. Усяго здана дзяржаве 1.600 тон ЗБОЖЖА, што складае 10 проц. гадавога пляну; у сярэднім па раёне гадавы плян збожжазагатовак выкананы на 30 проц

У гэты-ж дзень прыбыў другі чырвоны абоз са 100 фурманак, які здаў на загатоўчую базу 16.000 кгр. ІЛЬНЯНОГА СЕМЯ.

Калгасы Шклоўшчыны ўзялі на сябе абавязак падцягнуць аднаасобны сэктар і дабіцца выкананьня да 1-га кастрычніка 50 проц. гадавога пляну.

НОВІКАЎ.

Там, дзе „ня бачаць" кулака

ЛЕПЕЛЬ

Збожжазагатоўчая кампанія па Лепельшчыне не разгорнута належнымі тэмпамі. Райспажыўсаюз, Саюзхлеб замест баявой работы, сядзяць склаўшы рукі і спадзяюцца на самацёк. Партыйныя ячэйкі і сельсаветы на месцах таксама бязьдзейнічаюць. У выніку ГАДАВЫ ПЛЯН збожжазагатовак па раёне выкананы толькі на 14,8 проц. Калгасы далі 11,9 проц. свайго заданьня, аднаасобны сэктар — 17,4 проц.

Зусім дрэнна спаганяецца збожжа з кулацка - заможных гаспадарак ПА ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯХ. На сёньняшні дзень ад кулакоў паступіла толькі 10 проц. заданьня.

Паасобныя работнікі заяўляюць, што «кулацка-заможная частка ня мае вялікага значэньня для збожжазагатовак». Гэтыя яўна апартуністычныя настроі не сустракаюць адпору з боку кіруючых раённых арганізацый.

Трэба неадкладна дабіцца карэннага эруху ў ходзе кампаніі. Райком КП(б)Б і РВК абавязаны ўзмацніць кіраўніцтва збожжазагатоўкамі, ачысьціць загатоўчы апарат ад апартуністаў і бюракратаў і дабіцца поўнага выкананьня пляну збожжазагатовак.

АЛЕСЬ НАЛЁТНЫ.

Толькі 8 проц. пляну

ВУЗДА

На 15 верасьня Вузьдзенскі раён выканаў плян збожжазагатовак усяго на 8 проц. Большасьць сельсаветаў дагэтуль фактычна ня ўключылася ў збожжазагатоўчую кампанію. Малацьба разгорнута зусім слаба.

Крысьпіноўскі, Цялкоўскі, Цаплінскі і Слабодзішрашаўскі сельсавет да гэтага часу не здалі вёдзнага цэнтнэра збожжа. Упаўнаважаныя РК КП(б)Б і РВК па гэтых сельсаветах літаральна бязьдзейнічаюць.

Райком КП(б)Б і райвыканком павінны зараз-жа прыняць меры да максымальнага ўзмацненьня тэмпаў збожжазагатовак. Сельсаветы, якія ганебна правальваюць кампанію, павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Жаласлівыя да кулакоў

ДУБРОЎНА.

Па многіх сельсаветах і калгасах Дубровенскага раёну збожжазагатоўкі яшчэ фактычна не распачаліся. Па Ўскоўскім, Будаўскім і Бельскім сельсаветах ня даны яшчэ цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам.

На сёньняшні дзень райсаюзу здана калі пасамі «Авангард», «Перамога», «Прамень Кастрычніка», «Чырвоны Чырнёў» і імя Блюхера — 734 цнт. збожжа. Далейшага эруху пакуль што няма.

Неабходна зараз-жа ўсім арганізацыям раёну рашуча пераключыцца на баявое правядзеньне збожжазагатовак.

Чарняўскі.

СЕНАЗАГАТОЎКІ

Засталося пяць дзён

ПЛЯН ЗАГАТОВАК СЕНА ПА БССР ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 60,4, ПРОЦ. САЛОМЫ—НА 4,3 ПРОЦ.

Паводле заданьня партыі і ўраду плян сеназагатовак па БССР да 1 кастрычніка павінен быць выкананы на ўсе 100 проц., загатовак саломы — ня менш 35 проц.

Аднак, апошнія даныя паказваюць, што на фронце загатовак сена і саломы ня зусім добра. Плян загатовак сена па рэспубліцы выкананы толькі на 60,4 проц., саломы — 4,3 проц.

Гэты ганебны прарыў тлумачыцца ў першую чаргу апартуністычнай недацэнкай сеназагатоўчай кампаніі з боку раду раённых арганізацый. Даволі сказаць, што НЕКАТОРЫЯ РАЁНЫ ДА ГЭТАГА ЧАСУ ФАКТЫЧНА ЯШЧЭ НАВАТ НЯ ЎКЛЮЧЫЛІСЯ Ў ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СЕНАЗАГАТОВАК. Так, ВУЗЬДЗЕНСКІ раён на 15 верасьня выканаў плян: па сене на 2 проц. пляну, саломы—0,4 проц.; ПЛЕШЧАНІЦКІ раён загатовіў сена 13,2 проц. пляну, саломы — 0,8 проц.; АСЬВЕЙСКІ раён загатовіў сена — 13,6 проц., саломы — 0,4 проц.

Гэтыя раёны не ўявілі вялікага значэньня стварэньня кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Яны не мабілізавалі мас на барацьбу за выкананьне пляну загатовак сена і саломы, не разгарнулі бальшавіцкіх тэмпаў работы.

Той факт, што рад раёнаў выканалі і перавыканалі пляны сеназагатовак БЯЛЫНІЦКІ — на 112, проц., ЖЛОБІНСКІ — на 109,9 проц., КРЫЧАЎСКІ — на 172,4 проц., НАРАЎЛЯНСКІ — на 121 проц., ПУХАВІЦКІ — на 108 проц., ЧЭРЫКАЎСКІ — на 115,6 проц., ЛЁЗЬНЯНСКІ — на 110 проц.) сведчыць, што там, дзе загатоўчыя арганізацыі з самага пачатку па-ўдарнаму ўключыліся ў кампанію, мабілізавалі вакол сеназагатовак шырокія масы калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў,—там посьпех загатовак быў забясьпечан. Сустрэчнымі плянамі, шырокім разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва перадавыя раёны дабіліся перавыкананьня сваіх плянавых заданьняў.

Трэба ў бліжэйшы час дабіцца карэннага эруху ў ходзе загатовак сена і саломы па рэспубліцы. Да канца трэцяга кварталу засталося яшчэ 5 дзён. Гэты час трэба выкарыстаць поўнасьцю для ліквідацыі прарываў на фронце загатовак. Перадавыя сельсаветы і калгасы павінны ўзяць на грамадзкі буксір адстаючых, дапамагчы ім у правядзеньні кампаніі.

Трэба бязьлітасна ўдарыць па кулацкай агітацыі і сабатажы сеназагатовак. Неабходна ўстанавіць пільны кантроль за выкананьнем цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі.

Загатоўкі сена па БССР на 20 верасьня (у процантах)

Разам па БССР	Калгасы	Аднаасобны сэктар
60,4	64,4	50,1

Агідная безгаспадарчасьць

ВУЗДА.

Каменскае сельскае спажыўтаварыства накіроўвае загатоўленае сена і салому ў вёску Плоская для прасаваньня. Там усё сена і салома ляжаць над адкрытым небам і псуюцца ў той час, як у вёсцы шмат вольных будынкаў, якія можна скарыстаць для гэтай мэты.

Старшыня сельспажыўтаварыства тав. Кантаровіч зусім ня цікавіцца гэтай справай і на прапанову сельсавету знайсьці адпаведнае памяшканьне для сена і саломы адказвае: «Калі сельсавету патрэбна, няхай сам шукае будынку».

Трэба прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у гэтай агіднай безгаспадарчасьці.

Ярмак.

БАРАЦЬБА ЗА ЛЁН

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ МЯЛЬНЫЯ ПУНКТЫ СУШЫЛКАМІ

Наркамзем і Калгасцэнтр ня кіруюць падрыхтоўкай да мяцьца і трапаньня ільну і ня ведаюць, што робіцца на мясцох

АРГАНІЗАЦЫЯ МЯЛЬНА-СУШЫЛЬНЫХ ПУНКТАЎ ПА-РАНЕЙШАМУ ПАГРАЖАЕ ПАСЬПЯХОВАМУ РАЗГОРТВАНЬНЮ ІЛЬНАЗАГАТОВАК

Наступіў пэрыяд масавай пераапрацоўкі трасты.

Аднак, і на сёньняшні дзень далёка ня ўсе меры прыняты, каб забясьпечыць пасьпяховае разгортваньне гэтай важнейшай работы.

Карэспандэнцыі з месц сыгналізуюць, што падрыхтоўка ільнаапрацоўчых пунктаў знаходзіцца ў пагражаючым становішчы, значыць пад пагрозай і пераапрацоўка ільну.

У СЛУЦКІМ раёне паводле пляну трэба было арганізаваць 15 пунктаў, а дагэтуль не арганізавана ніводнага. У ЛЕПЕЛЬШЧЫНЕ замест 9 пунктаў арганізаваны 2. ЧАШНІЦКІ раён усё яшчэ плыве на хвалях самацёку.

Раёны чакаюць завозу буйных ільнамялак і нічога ня робяць для таго, каб выкарыстаць двух і трохвальныя мялкі. Паведамленьні з раёнаў гавораць, што прыстасаваньне сушань — самае слабое месца ў падрыхтоўчай рабоце да апрацоўкі ільну. Нават двух і трохвальныя мялкі ня будуць цалкам загружаны пры наяўнай колькасьці сушань. Прыстасаваньне для сушань звычайных сялянскіх сўняў, пазень, хлявоў, нежылых дамоў і інш. халодных будынкаў не вядзецца. Печкі ў сушнях, якія ўжо ёсьць, не рамантуюцца.

Наркамзем і Белкалгасцэнтр таксама чакалі завозу буйных мялак і не прынялі мер да арганізацыі пераапрацоўкі на дробных чыгунных і драўляных ільнамялках, нічога не зрабілі па падрыхтоўцы сушань. Наркамзем нічога не зрабіў, каб дакладна ўлічыць наяўнасьць ільнамялак у розных раёнах, і ня прыняў мер для іх перакідкі ў асноўныя ільнаводчыя раёны. Наркамзем і Калгасцэнтр ня ведаюць, што канкрэтна зроблена на мясцох, у якім становішчы знаходзяцца тыя пункты, якія ўжо арганізаваны. Наркамзем пастанавіў у гэтым годзе арганізаваць 400 ільнаапрацоўчых пунктаў і 80 пунктаў па пераапрацоўцы каналель, адрамантаваць усе старыя пункты. Як ідзе рамонт і будаўніцтва новых пунктаў — ні Наркамзем, ні Калгасцэнтр ня ведаюць.

Асобныя працаўнікі сэктару тэхкультур у Калгасцэнтры заяўляюць, што ў сапраўднасьці можа здарыцца так, калі замест 226 пунктаў, якія паводле зводак лічацца арганізаванымі, падрыхтавана будзе толькі 6. Гэта значыць, што пункты могуць аказацца без машын, на завоз якіх чакалі як раёны, так і Белкалгасцэнтр.

Белкалгасцэнтр меркаваў паслаць у раёны людзей для праверкі сапраўднага становішча, але дагэтуль нікога не паслаў.

Церабленьне ільну, абмалот і ачос галовак, мочка і расьціл саломы яшчэ ня ўсюды скончаны. У паасобных калгасах і саўгасах ёсьць буйныя прарывы. Так, у калгасах «КАМУНАР» і «КАМІНТЭРН», Койданаўскага раёну, выцераблены лён пляжыць на полі і мокне пад дажджом. У саўгасе «БІГОСАВА» ня скончана церабленьне ў выніку безгаспадарчасьці дырэкцыі і бязьдзейнасьці парт'яч ні. Такое становішча наглядаецца і іншых раёнах.

Заканчваючы ўборку, пры шыро разгортваньні апрацоўкі ільну, пазбе быць забясьпечана своячасовая зд ільна-вапажна.

І тут ёсьць буйнейшыя прарывы.

У Слуцкім раёне пляны ільнапрац кі да сельсаветаў не даведзены. Куп і заможнікі не атрымалі цьвёрдых даньняў. Складаў для валакна арг завана мала. У Вушацкім раёне на прыёмшчыкаў ільнавалакна. Райкам юз бязьдзейнічае і заяўляе, што н людзей.

Усе гэтыя агідныя факты паказ ць, што НАРКАМЗЕМ БЕЛАРУ БЕЛКАЛГАСЦЭНТР І БЕЛІЛЬНАКАН ПРАВОДСАЮЗ НЕ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА АГ РАЦЫЙНЫМІ КІРАЎНІКАМІ ВАЖНЕ ШАЙ КАМПАНІІ ПА ПЕРААПРАЦ ЦЫ ІЛЬНУ І ЗДАЧЫ ВАЛАКНА ДЗЯ ЖАВЕ.

Патрэбны самыя энэргічныя ме для таго, каб ліквідаваць усе адзна ныя прарывы.

Падрыхтоўка сушань, арганізацыя р боты на двух і трохвальных мял забясьпячэньне поўнага выкарыстань ўсіх будынкаў, у якіх можна сушы пён, увядзеньне кругласуточнай працы пунктах — неадкладная задача НК БКЦ і раённых кіруючых арганізацы

Увядзеньне зьдзеўшчыны, праві ная расстаноўка сіл, разгортваньне с спаборніцтва і ўдарніцтва, уцягнень ў конкурс на хуткую апрацоўку і зда валакна дзяржаве шырокіх мас калга нікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і с раднякоў — забясьпечыць выканань пастаўленых задач у барацьбе за лён

Перадавыя калгасы пачалі пераап цоўку ільну, валакно паступае на за тоўчыя пункты. ТОЛЬКІ ЛІКВІДАВА ШЫ ПАКАЗАНЫЯ НЕДАХОПЫ, М ЗМОЖАМ ЗДАЦЬ ДЗЯРЖАВЕ 20 ПРО ВАЛАКНА Ў ВЕРАСЬНІ-КАСТРЫЧН КУ І СКОНЧЫЦЬ ІЛЬНАПЕРААПР ЦОЎКУ І ЗДАЧУ ВАЛАКНА НЕ ПАЗ НЕЙ 1-ГА СТУДЗЕНЯ.

Гарадоцкая партарганізацыя стала на чале ільнаапрацоўкі

ГАРАДОК. Па Гарадоцкім раёне на 15 верасьня церабленьне ільну скончана. Абмалочана і зрэсана галовак ільну па калгасах 94,4 проц., выцераблена ільну і па аднаасобным сэктары—98 проц. Замочана і разаслана ільнатрасты па калгасах 94,2 проц. і па аднаасобным сэктары 97,7 проц. Па апрацоўцы ільну ГАНЕБНА АДСТАЕ ПРАЛЕТАРСКІ СЕЛЬСАВЕТ, у якім толькі ПА АДНЭЙ КАМУНЕ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА 30 ГЭКТАРАЎ ВЫЦЕРАБЛЕНАГА ІЛЬНУ СТАІЦЬ ПАД ДАЖДЖОМ.

НА ЗАГАТОЎЧЫЯ ПУНКТЫ ПРЫБЫВАЮЦЬ ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ З ІЛЬНЯНЫМ СЕМЕМ.

Зараз работа ўсіх арганізацый раёну накіравана на тое, каб поўнасьцю выканаць пляны загатовак ільнянога семя і ільна-валакна.

Партарганізацыя раёну ўсю сваю ўвагу накіравала зараз на пераапрацоўку ільну і здачу дзяржаве таварнай прадукцы

15 ВЕРАСЬНЯ БЫЛІ ПРАВЕДЗЕНЫ КУСТАВЫЯ ПАРТЫЙНЫЯ СХОДЫ Н ЧАТЫРОХ ПУНКТАХ: ГАРАДОК, ЯЗЕ РЫЦЧА, МЯЖА і СЕЛІШЧА. Выпрац ваны канкрэтныя мерапрыемствы.

МАСАВАЯ ПЕРААПРАЦОЎКА ІЛЬНУ РАЗГОРТВАЕЦЦА.

ЗАЙЦАЎ К.

Канвэер перамагае

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. (БелТА). Дзякуючы правільнаму наладжаньню ільнянога канвэеру, пераключэньню з церабленьня на абмалот, мочку і расьціл ільну ўсёй рабочай сілы, калгас «Заветы Ільіча» № 2 прыступіў ужо да апрацоўкі трас

ПАРТЫИНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Сацыялістычныя мэтады працы— у работу кожнага зьвяна партасьветы

На рэйкі сацспаборніцтва

Алошняя прамова тав. Постышава, пастанова ЦК КП(б)Б аб партвучобе і Усебеларуская культпрапкарада далі вычарпальныя паказаньні аб тых новых задачах марксыцка-ленінскага выхаваньня, якія ўзьнікалі ў сувязі з новымі ўмовамі і задачамі ў разьвіцьці сацыялістычнай гаспадаркі і культуры.

Паляпшэньне якасьці работы ўсёй сеткі партыйнай асьветы, цесная ўвязка яе з штодзённымі гаспадарча-палітычнымі задачамі партыі на ўсіх участках работы — стрыжнёвая задача партыйных арганізацый у справе разгортваньня марксыцка-ленінскага выхаваньня.

15 верасьня — быў намечан першым днём партыйнай вучобы. У радзе раёнаў, дзе партыйная вучоба была ўзьнята на прынцыпова-палітычную вышыню, мы маем ужо значныя посьпехі ў пастаноўцы работы партыйных школ і гурткоў. Стварэньне належнай грамадзкай думкі сярод партыйных мас, рабочых і калгасьнікаў вакол правядзеньня падрыхтоўкі да новага навучальнага году, ужываньне сацыялістычных форм і мэтадаў у разгортваньні марксыцка-ленінскага выхаваньня забясьпечылі Койданаўскаму, Пятрыкоўскаму і раду іншых раёнаў здавальняючыя вынікі камплектаваньня і пачатку работы ў сетцы партасьветы.

Аднак, факты і лічбы з месц сыгналізуюць аб тым, што яшчэ і на сёньняшні дзень у арганізацыі і рабоце партыйнай сеткі па радзе раёнаў мы ня маем патрэбных ня толькі якасных, але і колькасных паказальнікаў. У некаторых партарганізацыях яшчэ не зразумелі таго, што яны за пастаноўку работы партвучобы адказваюць у такой-жа меры, як і за важнейшыя гаспадарчыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва.

У апошні час мы можам адзначыць некаторы зрух наперад у справе разгортваньня марксыцка-ленінскага выхаваньня, але гэты зрух у значнай частцы раёнаў (Віцебскі, Талачынскі і інш.) мае месца толькі яшчэ ў рэзалюцыях, пастановах і выступленьнях. У Чачэрскім і некаторых іншых раёнах мы маем справу з яўнай апартуністычнай недавацэнкай гэтай работы з боку кіруючых раённых арганізацый.

Усё гэта з асаблівай вострасьцю стаіць перад намі задачу — рашуча ўдарыць па шкодных настроях, па недацэнцы партыйнай вучобы і ў самы кароткі тэрмін пераключыцца на баявы тэмпы работы па ажыцьцяўленьні дырэктывы партыі аб разгортваньні марксыцка-ленінскага выхаваньня.

Вопыт ПЯТРЫКОЎСКАЙ партарганізацыі паказаў, што важнейшай умовай посьпяховага выкананьня гэтай задачы зьяўляецца перанясеньне ўсёй нашай зботы ў галіне ўзбраеньня партыйных мас тэорыяй марксызму і ленінізму на вэйкі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Гэта ўмова павінна быць утрымана ўсюды без выключэньня партыйнымі арганізацыямі на месцах. Выверанымі мільённымі масамі сацыялістычныя формы мэтады працы дапамогуць нам у найкоўкай ступені аўладаць марксыцка-ленінскай тэорыяй.

„Партарганізацыя нясе адказнасьць за становішча гэтага адказьнейшага вучастку работы ў такой-жа меры, як і за выкананьне рашаючых задач гаспадарчага будаўніцтва" (з пастановы ЦК КП(б)Б)

ЗРУХ ЁСЬЦЬ

ПЯТРЫКОЎСКІ РК КП(б)Б своячасова разгарнуў работу па падрыхтоўцы да навучальнага году. Гэта пытаньне было абгаворана на бюро райкому. Праведзена нарада партактыву, мабілізавана 10 партыйцаў з раённага актыву для дапамогі сельскім парт'ячэйкам у арганізацыі сеткі партасьветы.

У сувязі з прыездам прапбрыгады ЦК КП(б)Б і пасылкай на раён актыву ёсьць значны зрух у рабоце.

Зараз школы ўкамплектаваны слухачамі. У школах каля 60 проц. беспартыйных рабочых і калгасьнікаў. ПАМІЖ ЯЧЭЙКАМІ І ПАРТШКОЛАМІ ЗАКЛЮЧАНЫ САЦДАГАВАРЫ НА ЛЕПШУЮ ПАСТАНОЎКУ ПАРТВУЧОБЫ І НА ВЫПІСКУ КОЖНЫМ СЛУХАЧОМ ШКОЛЫ ЧАСОПІСІ «БАЛЬШАВІК», «ПРАПАГАНДЫСТ» І ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА».

ЦЭХЯЧЭЙКІ ЗАВОДУ «ЗЬВЯЗДА» ВЫСУНУЛІ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН ПА СКАРАЧЭНЬНІ ТЭРМІНУ ПАЧАТКУ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ.

Дрэнна тое, што партшколы пры заводзе «Зьвязда» не забясьпечаны належнымі праграмамі. Няма падручнікаў для кандыдацкіх школ. У асаблівасьці для вясковых палітшкол адчуваецца недахват прапагандыстаў.

С. ХІЛЬКЕВІЧ.

Раней тэрміну

Дырэктыва ЦК КП(б)Б аб укамплектаваньні сеткі партасьветы да 15 верасьня па **Койданаўскім** раёне ў асноўным выканана. На аснове шырокай папулярызацыі пастаноў партыі аб задачах марксыцка-ленінскага выхаваньня сярод партыйнай арганізацыі, рабочых чыгункі, саўгасаў і калгасьнікаў укамплектаваньне сеткі партшкол у раёне праведзена своячасова, што дало магчымасьць у радзе школ распачаць заняткі датэрмінова. **53 школы па раёне распачалі заняткі да 15 верасьня.**

Першымі па падрыхтоўцы да новага навучальнага году ідуць **Сталінскі і Сьвярдлоўскі** сельпарткомы. Сталінскі сельпартком арганізаваў 20 школ, якімі ахоплены ўсе члены партыі. 65 проц. агульнага ліку слухачоў на гэтых школах складаюць беспартыйныя рабочыя саўгасаў. **Сьвярдлоўскі** сельпартком арганізаваў 8 школ, у якіх навучаецца 168 слухачоў. **Заняткі школ, арганізаваных гэтымі партыйнымі камітэтамі, пачаліся 10 верасьня.**

Трэба адзначыць, што некаторыя парткомы і ячэйкі недаацанілі гэтай важнейшай справы. **Зусім нездавальняюча праведзена работа па Негарэльскім сельпарткоме** і ячэйках **Анопаля, Самуэлева, Старынак і крэйдаваленкага заводу.**

Зараз асаблівую ўвагу ячэйкі павінны аддаць арганізацыі партшкол у нацыянальных польскіх сельсаветах і забясьпечыць іх адпаведнымі кадрамі кіраўнікоў

Атахель.

Абмежаваліся складаньнем пляну

На віцебскай фабрыцы «Дзьвіна» працуе 2.000 рабочых, з якіх 200 партыйцаў і 680 камсамольцаў. На плядзячы на такую вялікую колькасьць партыйна-камсамольскага ядра, на «Дзьвіне» яшчэ дагэтуль не падрыхтавана пастаянная сетка партвучобы. Нічога ня зроблена ў напрамку забесьпячэньня школ прапагандыстамі. Вызначаным гаркомам партыі 8 дзён у месяц на партвучобу партколектывам заводу скарочаны да 5-ці дзён.

Ня лепш стаіць справа на Віцебскім Чыгуначным вузьле. З 1.000 рабочых, якія працуюць на эксплёатацыі, 165 партыйцаў, а партвучобай ахоплена ўсяго толькі 169 чалавек. Па капітальнае цягі з 2.000 рабочых і 500 камуністаў толькі 198 ахоплены партвучобай. Такое-ж становішча мае месца і па іншых ячэйках Віцебскага чыгуначнага вузла.

Дрэнна пастаўлена справа з разгортваньнем партвучобы на заводзе «Чырвоны мэталіст». Парткалектыў склаў пляны, але практычна да іх ажыцьцяўленьня не прыступіў. Вярбоўка ў партыйныя школы праходзіць марудныемі тэмпамі

Зарубежны.

Габінэтным парадкам

На **Талачынскім раёне** падрыхтоўка да новага навучальнага году партасьветы правалена. Ніякай растлумачальнай работы па гэтым пытаньні сярод партыйных мас і калгаснага актыву не праводзілася, у выніку партвучоба на зімовы час па раёне пастаўлена пад пагрозу.

Праўда, нядаўна Талачынскі райком партыі вынес пастанову аб арганізацыі пры кожнай ячэйцы саўпартшколы і пры кожным калгасе гурткоў бягучай палітыкі. Аднак, арганізацыя партшкол так і засталася ў пратаколе. З 15 верасьня павінны былі распачаць работу курсы па падрыхтоўцы прапагандыстаў для нізавых зьвяньняў партсеткі, але і дагэтуль курсы яшчэ не працуюць.

Яшчэ горш стаіць справа з разгортваньнем марксыцка-ленінскага выхаваньня ў камсамольскай арганізацыі раёну. Дырэктывы ЦК ЛКСМБ па гэтым пытаньні ў райкоме камсамолу яўна ігнаруюцца.

Разам з разгортваньнем шырокай масавай работы сярод партыйных мас, рабочага і калгаснага актыву на папулярызацыі пастановы ЦК КП(б)Б аб партвучобе, райком партыі павінен неадкладна распачаць арганізацыю намечаных партшкол і гурткоў з тым, каб своячасова пачаць заняткі.

А. Генін.

„Гэта справа не мая..."

Падрыхтоўку да новага навучальнага году па партасьвеце ў Чачэрскім раёне пачалі толькі з 6 верасьня, калі ў раён прыехала брыгада Культпропу ЦК КП(б)Б. Райком партыі да справы разгортваньня марксыцка-ленінскага выхаваньня адносіцца зусім нядбайна. Калі брыгада Культпропу ЦК зьвярнулася да сакратара райкому тав. **Кругліка**, каб апошні вылучыў ім у дапамогу некалькі чалавек мясцовага партактыву, дык тав. **Кругліка** адказаў:

— Гэта справа культпропу, ідзеце да яго. У мяне-ж людзей няма для вас, бо трэба праводзіць розныя кампаніі.

Курсы па падрыхтоўцы прапагандыстаў, якія склікаліся ўлетку, сарваліся. Пры складаньні сеткі партвучобы на новы навучальны год культпроп райкому намеціў склікаць курсы паўторна з 12 верасьня, разьлічаныя на 17 асоб. Аднак, на курсы зьявілася толькі 12 асоб, з якімі 14 верасьня распачалася работа.

У раёне ёсьць шмат завочнікаў, але ніякай дапамогі з боку райкому партыі няма. Радыёвуток для завочнікаў не прыстасаваны для заняткаў. Раённыя кан сультанты па завочным навучаньні і партгабінэт да гэтага часу не працуюць.

Чачэрскі райком партыі павінен неадкладна зьвярнуць падобныя адносіны да разгортваньня партвучобы.

ПАСТАНОВА

Сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб выданьні „Гісторыі грамадзянскай вайны ў Беларусі"

1. У ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 30 ліпеня 1931 г. аб выданьні «для шырокіх працоўных мас «Гісторыі грамадзянскай вайны» (1917-21 г. г.) у 10-15 томах у выглядзе аборніка навукова-гістарычных артыкулаў і літаратурна-мастацкіх твораў», прыступіць да зьбіраньня матар'ялаў аб грамадзянскай вайне ў Беларусі.

2. Зьбіраньне матар'ялаў павінна быць як з мэтай садзейнасьці і дапамогі па стварэньні агульна-савецкай «Гісторыі грамадзянскай вайны», так і з мэтай асобнага выданьня «Гісторыі грамадзянскай вайны ў Беларусі» на беларускай мове і мовах нацыянальных меншасьцяй (яўрэйскай і польскай).

3. Для рэдагаваньня матар'ялаў, якія будуць зьбірацца для агульна-савецкай «Гісторыі грамадзянскай вайны» і для рэдагаваньня «Гісторыі грамадзянскай вайны ў Беларусі» скласьці: а) палітычную рэдакцыю з т. т. **Аранштама, Ашарсвіча, Будзінскага, Бэнэка, Гападзова, Гаруновіча, Горына, Гея, Кнорына, Канакоціна, Ляўкова, Поташа, Убарэвіча, Славінскага, Сэрбэнты, Чарнушэвіча, Чарвякова, Шаранговіча і Югава.**

б) Мастацкую рэдакцыю з т. т. **Сянкевіча, Вансоўскага, Дунца, Шастакова, Харыка, Ліманоўра, Сталевіча, Чарота, Галавача, Лыньскога, Александровіча, Неманскага (Пятровіча), Крапівы.**

4. Стварыць сакратарыят рэдакцыі пры інстытуце гісторыі партыі ЦК КП(б)В.

5. Пры РК і ГК КП(б)В арганізаваць камісію садзейнасьці па зьбіраньні матар'ялаў гісторыі грамадзянскай вайны у складзе 3-5 чалавек пад кіраўніцтвам члена бюро гаркому і райкому КП(б)В.

6. Разгарнуць зараз-жа масавую работу па зьбіраньні матар'ялаў па «Гісторыі грамадзянскай вайны» на працягу 1931-32 г. г. Гэту работу ўвязаць з пятнаццатай гадавінай Кастрычніка.

Усім барацьбітом за Кастрычнік

ТАВАРЫЦЫ!

ЦК УсеКП(б) адобрыў ініцыятыву таварыша М. Горкага і паравшу прыступіць да выданьня для шырокіх мас «Гісторыі грамадзянскай вайны» (1917-21 г. г.) у выглядзе асобных абораў навукова-гістарычных артыкулаў і літаратурна-мастацкіх твораў. У адпаведнасьці з гэтым рашэньнем ЦК КП(б)Б прыняў пастанову, якая прыводзіцца ў даным нумары «Зьвязды», аб зьбіраньні матар'ялаў і выданьні «Гісторыі грамадзянскай вайны» на Беларусі.

Пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б маюць для Беларусі надзвычай важнае значэньне.

Змаганьне пралетарыяту і працоўнага сялянства Беларусі за Савецкую ўладу і замацаваньне Кастрычніка на тэрыторыі Беларусі займае цэнтральнае месца ў гісторыі грамадзянскай вайны.

Пакажам на галоўныя этапы гэтай барацьбы.

1917 ГОД:

Заходні фронт. На тэрыторыі Беларусі разьмясьцілася 2-хмільённая шматнацыянальная армія, у склад якое ўваходзяць рабочыя і сяляне ўсіх абласьцей былой Расійскай імпэрыі: **Беларусі, Літвы, Латвіі, Вялікарусі, Украіны, Польшчы, Каўказу, Сібіры** і інш.

Змаганьне кампартыі з агентамі Часовага Ураду, чорнасоценным царскім вайсковым камандаваньнем, з контр-рэвалюцыйнымі дробна-буржуазнымі партыямі—Бундам, меншавікамі, БСГ, эсэрамі, поалей-цыёністамі і інш.—дае пераможны выхад з баёў за Кастрычнік на Беларусі. Гэтыя баі адначасова зьяўляюцца часьцю агульных баёў усіх народаў былой царскай імпэрыі за ўстаноўленьне дыктатуры пралетарыяту.

Змаганьне з карнілаўшчынай, якая мае на Беларусі свае галоўныя штабы і стратэгічныя пункты.

Змаганьне з вялікадзяржаўніцкай і нацыянал-дэмакратычнай контр-рэвалюцыяй («Комитет спасения», «Усебеларускі кангрэс»).

Першыя сутычкі з польскім корпусам Даўбор-Мусьніцкага.

1918 ГОД.

Працяг змаганьня з корпусам Даўбар-Мусьніцкага. Змаганьне з нямецкімі акупантамі. Першы зьезд КП(б)Б. Агалашэньне БССР.

1919-20 г. г.

Утварэньне Літоўска-Беларускай Рэспублікі. Гераічнае змаганьне з беларапалякамі ў глыбокім падпольлі. Шырокі размах партызанскага руху пад кіраўніцтвам партыі. Вызваленьне БССР.

1921—СЯРЭДЗІНА 1922 г.

Змаганьне з палітычнымі бандытызмам (Савінкаў, Булак-Балаховіч і інш.). Заканчэньне грамадзянскай вайны на Беларусі.

Гэтыя этапы грамадзянскай вайны на Беларусі пераплоўнены незьлічонымі ўзорамі гераічнай работы кампартыі, глыбокай інтэрнацыянальнай салідарнасьці працоўных мас, балывымі гэройствамі рабочай моладзі і працоўных жанчын. Усіх прыкладаў не пералічыць. Даволі паказаць на дзейнасьць першых салдацкіх і рэвалюцыйных арганізацый на фронце, на дзейнасьць палітызаваных салдат-бальшавікоў, утварыўшых першы рэвалюцыйны полк імя Менскага савету, які адыграў вялікую ролю ва ўзбраеньні рэвалюцыі ў пэрыяд Кастрычніка, на змаганьне латыскай дывізіі в легіёнамі Даўбар-Мусьніцкага, на абарону Менску ў 1919 г. атрадамі яўрэйскіх і беларускіх рабочых, абарону «Савою» ў часе Стракапытаўскага паўстаньня, абарону Віленскага савету ў 1919 г., на змаганьне Заходняй польскай дывізіі, якая дзейнічала супроць белапалякаў, на гераічныя паводзіны сотень і тысяч партызан і падпольных партыйных працаўнікоў, многія з якіх расстрэлены і замучаны польскімі ахранынікамі і г. д., і т. д.

Гісторыя грамадзянскай вайны, гэта гісторыя гераічнага змаганьня пралетарыяту і рэвалюцыйнага сялянства, якія пад кіраўніцтвам кампартыі ўступілі ў апошні рашаючы бой супроць старога памешчыцка-капіталістычнага ладу. У працэсе змаганьня яны вылучылі шмат асобных герояў, асобных выдатных правадыроў.

Але гісторыю рабіла маса і толькі маса па плячы яе напісаць.

«Гісторыя грамадзянскай вайны» павінна стаць справай усёй пралетарскай грамадзкасьці, усіх партыйных, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый, усіх навукова-дасьледчых, літаратурна-мастацкіх інстытутаў і таварыстваў, (т-ва гісторыкаў-марксыстаў, арганізацыі БелАШН'у, краязнаўчых арганізацый ТВДТ і інш).

Да складаньня гісторыі павінны быць прыцягнуты ўсе ўдзельнікі грамадзянскай вайны: былыя чырвоногвардзейцы, чырвонаармейцы, партызаны, падпольныя работнікі.

У гэтай працы могуць быць выкарыстаны таксама і былыя ўдзельнікі адзінага руху, сярод якіх многія ланчатова парвалі са сваім мінулым і пачэр добрасумленна працуюць на карысьць пралетарскай дзяржавы.

Складаньне гісторыі—адна з нашых чарговых ударных задач. За не трэба ўзяцца в усёй бальшавіцкай энэргіі. Трэба памятаць, што наша гісторыя—гэта ня толькі апавяданьне аб гістарычным мінулым, гэта таксама багацейшая крыніца, адкуль пралетарыят БССР можа чэрпаць сьвежыя сілы і энэргію для сацыялістычнага будаўніцтва, пралетарыят-жа капіталістычнага Захаду для змаганьня за зьвяржэньне буржуазіі.

Наша гісторыя павінна стаць уласнасьцю самых шырокіх пластоў, што асабліва важна ва ўмовах БССР, дзе была вельмі пашырана ў апошнія гады гісторыя, фальсыфікаваная вялікадзяржаўнымі шавіністамі, нац.-дэмакратамі і бундаўцамі.

Савецкая Беларусь зьяўляецца фарпостам СССР у адносінах да капіталістычнага Захаду. Практыка змаганьня Савецкай Беларусі мае вялізнае значэньне для працоўных мас капіталістычнага Захаду, асабліва для рабочых мас Польшчы і Заходняй Беларусі, якія рыхтуюцца да свайго Кастрычніка. Гэта практыка павінна адыграць галоўную ролю і ў адносінах падняцьця абароназдольнасьці нашай краіны.

Ніводнага факту, ніводнай падзеі, ніводнага дакумэнту не павінна застацца па-за ўвагай гісторыкаў грамадзянскай вайны. На зьбіраньне гэтых фактаў і дакумэнтаў павінна быць накіравана работа ў першую чаргу, каб у хуткім часе, уцягнуўшы шырокія масы ўдзельнікаў, можна-б было пачаць пісаньне гісторыі вялікіх баёў перамог.

За работу, таварышы! За выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б!

Рэдакцыя «Гісторыі грамадзянскай вайны на Беларусі».

10-IX 1931 г., г. Менск.

* * *

Матар'ялы і запросы накіроўваць па адрасе: Менск, ЦК КП(б)Б, Інстытут Гісторыі партыі, для «Гісторыі грамадзянскай вайны».

Закончыць рамонт і абсталяваньні пачаць заняткі ва ўсіх школах

АБЯЗЬЛІЧКА Ў КІРАЎНІЦТВЕ

Да 1930 годуАКлімавіцкая прафтэхшкола знаходзілася пад загадам РВК і была на акруговым бюджэце. Пасьля ліквідацыі акругі прафшкола перайшла ў веданьне ВСНГ, а потым з 1 лютага яна рэарганізуецца ў ФЗВ на базе торфапрамысловасьці і перадаецца пад кіраўніцтва Белторфаб'яднаньня.

Новы «гаспадар» Белторф прыймку школы аформіў табінэтным парадкам. Фактычная праверкі школы не зрабіў ні ў часе прыёму, ні ў далейшай яе рабоце. З 1930 году зьмяніліся тры загадчыкі школы.

ФЗВ павінен у гэтым годзе вырасьці да 380 чалавек. Трэбе правесьці вялікую падрыхтоўчую работу, а Белторфаб'яднаньне гэтым ня цікавілася і ня цікавіцца. Прадстаўнік Белторфаб'яднаньня, які прыехаў у Клімавічы па выклику РК КП(б)Б, абяцаў вырашыць рад прыцыповых пытаньняў па дапамозе школе, але прайшло ўжо шмат часу і нічога ня зроблена.

ЗАГАДЧЫК У КАМАНДЫРОЎЦЫ

Работа ФЗВ адзе самацёкам. Загадчык **Невядомскі** на працягу паўтодзьдзя палову часу праезьджае па «камандыроўках» і ўсё з дазволу Белторфаб'яднаньня. На камандыроўкі патраціў шмат школьных грошай.

У выніку частых «камандыровак» загадчык **сарваў палову пенцый**, бо ён-жа зьяўляецца выкладчыкам пяці дысцыплін ва ўсіх клясах.

Школа ня мае вытворчых праграм і плянаў. Таксама няма выразнай устаноўкі, каго павінен рыхтаваць ФЗВ.

Адсутнасьць кантролю і цьвёрдага кіраўніцтва прывяла да поўнай безгаспадарчасьці. Не хапае маемасьці, спэцпраткі, пасьцельных прылад, інструментаў, матар'ялаў, начыньня і інш. Частка іх, як заявіў загадчык, пакрадзена яшчэ зімою. Аднак, ніхто высьвятленьнем гэтай справы не займаўся. Шмат разбазарана, раздана іншым асобам у «часовае карыстаньне».

Заказы прымаюцца і выконваюцца бясплатнава, самацёкам і падчас бяз ведама адміністрацыі, бяз уліку і кантролю. 75 проц. платы за выкананыя заказы ідзе ў кішэню інструктара і толькі 25 проц. за амартызацыю. Пры такім становішчы інструктары «вымаюць» каля 45 руб. у дзень апрача пэнсіі. Цьвёрдых расцэнак на заказы няма, яны залежаць ад асобістага погляду і «гандлёвай» здольнасьці Невядомскага. У выніку такой камэрцыйнай дзейнасьці ўся ўвага зьвернута на выкананьне прыватных заказаў, а заказы-ж для арганізацый ня выконваюцца па нескалькі месяцаў (напрыклад, сьвярды для Белторфу, прэсы для Сампрамаб'яднаньня і г. д.).

У галіне грошовых спраў таксама поўная бестгаспадарчасьць, якая мяжуецца са злачынствам.

ЗРЫВАЕЦЦА НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

Цяперашняе становішча ФЗВ не дае нармальных умоў для работы. Зусім адсутнічае майстэрня мэханічнага цаху, а майстэрні ЦПТ'у і сьлясарна-такарныя не абсталяваны. Не хапае матар'ялу і інструментаў, такарных, сьвідравальных і інш. варштатаў.

Павінна быць пабудавана мэханічная майстэрня, а Белторф да гэтага часу ня прыслаў праектаў і чарцяжоў пабудовы і сродкі на будаўніцтва адпусьціў толькі ў ліпені. Інтэрнат для вучняў не падрыхтаваны. Ёсьць памяшканьні на 70 часоў і ў рамонце на 130. Рамонт старых будынкаў пачаўся з вялікім спазьненьнем. На 180 чалавек няма зусім памяшканьня. Не хапае таксама і кляс.

Адсутнічаюць выкладчыкі спэцыяльных дысцыплін. Ня гледзячы на вялікі недахват кадраў, намесьнік загадчыка ФЗВ Давыдаў адкамандыраваў назад прысланага з Белторфаб'яднаньня спэцыяліста Гомана па матывах «за непатрэбнасьцю».

У школе ёсьць тры партыйцы: **Давыдаў, Іваноў і Дзянісаў.** Яны замест таго, каб дапамагчы беспартыйнаму загадчыку ў кіраўніцтве школай, блізьдзейнічалі, п'янствавалі, становішчам ФЗВ зусім ня цікавіліся і давялі ФЗВ да поўнага развалу.

РК КП(б)Б у апошні час (тэр'ёна зьмяніўся ФЗВ. Вылучана спэцыяльная камісія для высьвятленьня становішча і перспэктыў ФЗВ. Прызначан новы дырэктар. Ужыт рад канкрэтных мерапрыемстваў па палепшэньні работы школы.

Аднак, пры наяўнасьці пасыўных адносін да гэтай справы з боку Белторфаб'яднаньня палепшыць становішча і пачаць заняткі своячасова нельга. Патрэбнейшых органаў, якія-б аматлі ўзьдзейнічаць на Белторфаб'яднаньне, бо так як рыхтуе іх Клімавіцкі ФЗВ, значыць сьвядома зрываць работу.

Бальзоўскі.

Слухалі і... нічога не пастанавілі

У Талачынскім раёне работа па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці зусім забыта. Райпрафсавет і райкалгасаюз нічога не зрабілі на адшуканьні памяшканьняў для лікпунктаў і школ малапісьменных.

Рабочая і калгасная маса не мабілізавана вакол гэтага пытаньня. Райпрафсавет заслухаў інфармацыю райвыканкомаўцаў аб рабоце па ліквідацыі няпісьменнасьці, але да гэтага часу не зрабіў ніякіх канкрэтных выводаў.

Райпасажыўсаюз нічога ня робіць, каб забясьпечыць адпаведныя лікпункты лямпамі, прыладай і іншымі прыладамі. На складах гор. Магілева ёсьць дапалі зрэйды, але спажыўсаюз ня лічыць сваім абавязкам прывезьці яе. Ён заяўляе: **«Няхай едуць асьвятнікі, гэта іх справа».**

Пастанова нарады пры культпропе РК КП(б)Б аб унясеньні ў трохдзённы тэрмін грошай усімі ўстановамі на культурнае будаўніцтва ня выконваецца.

Раённым камсамольская арганізацыя ўзяла на сябе абавязацельства шефа Усесаюзнага навучаньня, але на справе **нічога ня робіць.**

Райком партыі, РВК і інспэктура ня вылучылі яшчэ культармейцаў з лепшых камуністаў, камсамольцаў, членаў саюзу і пісьменнага калгаснага актыву.

У раёне ёсьць шмат няпісьменных з яўрэйскага і польскага насельніцтва. Райінспэктарыят асьветы ня ўжыў ніякіх крокаў для забясьпячэньня нацыянальных лікпунктаў адпаведнымі падручнікамі. З гэтай прычыны Мархлеўскі польскі сельсавет зусім не пачынаў заняткаў.

Гэтымі днямі пры райкоме партыі адбылася спэцыяльная нарада, якая вынесла рад мерапрыемстваў па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, але і пасьля яе належнага пералому яшчэ няма.

Бандзяіч.

Новая школа гніе без страхі

ТАЛАЧЫН. Кручанскі сельскі савет пачаў навучальны год зусім неподрыхтаваным. Шмат дзяцей школьнага ўзросту не ахоплены школай. Прэзыдыум сельсавету работай школ зусім не займаецца. Школы не падрыхтаваны для нармальнай работы.

У калгасе «1 мая» яшчэ з 1929 году будуецца школа, але і зараз яна не закончана, не накрыта. Напалову папсаваліся ўжо сьцены.

9.000 РАБОЧЫХ—ДАНБАСУ

Чырвонапольскі райбанк ЗАТРЫМЛІВАЕ АДПРАЎКУ

Чакаем ад Дзяржбанку адпаведных указаньняў сваім філіялам

Фарсаваць вярбоўку!

Заданьне выканана ўсяго на 62 проц.

ЯК ІДЗЕ АДПРАЎКА У ДАНБАС

21 верасьня	22 верасьня	23 верасьня
326	327	197

На 24-га верасьня паслана ў Данбас 5.576 чалавек, або 62 проц. заданьня

ЧЫРВОНАПОЛЬЛЕ. Раён перавыканаў заданьне па вярбоўцы рабочых для Данбасу, завербаваўшы звыш заданьня 300 чал. Аднак, адпраўка гэтых людзей ганебна зрываецца РАЙБАНКАМ. Справа ў тым, што райбанк да гэтага часу ня выдаў грошай вярбоўшчыку для адпраўкі рабочых. Патрабуем неадкладнай выдачы грошай. Лічым, што Дзяржбанк павінен даць сваім філіялам адпаведныя ўказаньні.

ГОРКІ. Райарганізацыі бязьдзейнічаюць. Парт'ячэйкі, сельсаветы і калгасы не аказваюць ніякай дапамогі вярбоўшчыкам. Так, калгасы «ЗМАГАР», «ЧЫРВОНЫ ЎДАРНІК» і інш. ня пускаюць людзей у Данбас. Паводле заданьня НКТБ раён павінен даць Данбасу 150 гарняноў і райком ЛКСМ па заданьні ЦК ЛКСМБ павінен выпучыць у Данбас 40 камсамольцаў. На сёньняшні дзень адпраўлены ў Данбас 84 чал., з іх 19 камсамольцаў.

ЦЕРАХАЎКА. За апошні час у вярбоўцы наглядаецца некаторы зрух. 22-га верасьня ў Галубоўскім сельсавеце завербавана ў Данбас 40 калгасьнікаў і 60 аднаасобнікаў. 25 ВЕРАСЬНЯ АРГАНІЗАВАНЫМ ПАРАДКАМ АДПРАЎЛЯЕЦЦА 100 ЧАЛАВЕК. У іншых сельсаветах і калгасах раёну справа пастаўлена слаба. Так, у калгасе «Кастрычнік» адбыўся сход калгасьнікаў, на які НЯ ПРЫЙШОЎ старшыня калгасу БЯЛЯВЫ; вярбоўшчык быў прымушан сам адкрыць сход. На сёньняшні дзень адпраўлена ў Данбас 45 чал. пры заданьні ў 240.

* * *

ПРАПОЙСК. Райарганізацыі абмежаваліся толькі папяровымі распараджэньнямі. Штаб садзейнасьці не працуе. У выніку такой «работы» на сёньняшні дзень адпраўлены ў Данбас толькі 24 трэба паслаць 150.

чал. замест 250 паводле заданьня НКПБ.

* * *

БЯГОМЛЬ. На 22-га верасьня адпраўлены ў Данбас 52 адыходнікі. Заданьне — 150. Папярэдзіць зрыў вярбоўкі!

* * *

ХОЙНІКІ. Раёну, як кандыдату на прэмію, ТРЭБА ПАДЦЯГНУЦЦА. На 22 верасьня адпраўлены толькі 194 адыходнікі замест 300 паводле кантрольнай лічбы.

* * *

КАПЫЛЬ. Як паведамляе вярбоўшчык, у раёне на сёньняшні дзень завербавана 130 рабочых для Данбасу. 23-ГА ВЕРАСЬНЯ АДБЫЛАСЯ ПАСАДКА НА ЦЯГНІК 50 ЧАЛАВЕК. Паводле заданьня раён павінен даць Данбасу 250 рабочых.

* * *

СТАРОБІН. З-за нявысылкі грошай вярбоўшчыку ТАРАСКІНУ зрываецца адпраўка завербаваных рабочых. Райарганізацыі слаба садзейнічаюць вярбоўцы (заданьне 250 чалавек).

* * *

КОЙДАНАВА. На 22 верасьня завербавана 40 чалавек; АДПРАЎЛЕНА У ДАНБАС 5. Заданьне завербаваць 150 чалавек — пад пагрозай зрыву.

* * *

ТАЛАЧЫН. Раён зыходзіць з чорнай дошкі. На 22 верасьня адпраўлены 132 чалавекі і завербавана 160. (Заданьне — 200).

* * *

ВЕТКА. Паслана ў Данбас 70 рабочых замест 220. Не дапусьціць зрыву вярбоўкі рабочых для Данбасу.

* * *

СІРОЦІНА. Адпраўлена ў Калінінскае рудакіраўніцтва 56 чал. Паводле пляну

НА МАНЭЎРАХ СПА

УЛІЧЫЦЬ УРОКІ першага налёту

ГУТАРКА З НАЧАЛЬНІКАМ СПА ВВА ТАВ. МАТСОНАМ

Менскія манэўры СПА зьяўляюцца неадлучнай часткай вайсковых манэўраў часьцей РСЧА.

Па руху манэўрай «праціўнік» разгортвае наступальныя дзеяньні. Для таго, каб папегчыць сабе наступленьне—«праціўнік» імкнецца расстроіць тылы Беларускай дывізіі нашага боку, шляхам налёту на яе тылавыя базы.

Адным з галоўнейшых пунктаў тылоў зьяўляецца Менск, на які накіроўвае свой удар авіяцыя «праціўніка».

Як усім вядома, пры сучасным становішчы вайсковай справы тылы маюць вялізарнейшае значэньне і «праціўнік» заўсёды імкнецца як мага больш гэтыя тылы разбураць. Маючы гэта на ўвазе ўсё працоўнае насельніцтва павінна заўсёды быць гатовым да супроцьпаветранай абароны

Учора, у 14 гадзін на Менск быў зроблен налёт і скінуты газавыя бомбы.

Менскі пралетарыят у часе «нападу» даказаў, што ён здолен сябе абараняць.

Добра наогул працаваў пункт СПА. Некаторыя недахопы ў яго рабоце, якія стварыліся ў выніку таго, што пункт яшчэ зусім малады,—ліквідаваліся нахаду, дзякуючы вялізарнейшаму энтузіязму рабочых і адданай рабоце камандыраў і пастоў СПА на прадпрыемствах.

Своячасовая лўка па трывозе, дысцыплінаванасьць, добрае агульнае веданьне справы СПА—вось якое агульнае ўражаньне ствараецца ад работы ў часе «нападу» на прадпрыемствах Менску. Але было многа і недахопаў, фактаў неарганізаванасьці, расьцераснасьці, сумяцицы. Гэтых памылак трэба ўнікнуць у будучым.

Налёт быў у хуткім часе скончаны, але ГЭТА НЯ ЗНАЧЫЦЬ, ШТО СКОНЧЫЛАСЯ ПАГРОЗА НОВАГА «НАПАДУ». «ПАГРАЖАЮЧАЕ СТАНОВІШЧА», У ЯКІМ ЗНАХОДЗІЦЦА МЕНСК ЯШЧЭ НЕ ЗЬНЯТА. «ПРАЦІЎНІК» МОЖА У КОЖНУЮ ХВІЛІНУ ЗРАБІЦЬ НОВЫ «НАПАД». Таму працоўныя Менску не павінны паслабляць сваю ўвагу да СПА. Наадварот, патрэбна яшчэ большая пільнасьць. Неабходна на вопыце «нападу» ВЫЯВІЦЬ УСЕ НАЯЎНЫЯ НЕДАХОПЫ Ў СПРАВЕ СПА І ГЭТЫЯ НЕДАХОПЫ ЛІКВІДАВАЦЬ НА-ХАДУ.

Галоўнейшая ўвага павінна быць зьвернута на яшчэ большае ўзмацненьне ДЫСЦЫПЛІНЫ, на захоўваньне ПАРАДКУ, на яшчэ большую ВЫРАЗНАСЬЦЬ У РАБОЦЕ ПАСТОЎ І КАМАНД І КОЖНАГА РАБОТНІКА СПА.

«Ваенныя дзеяньні» ня спынены. Учора авіяцыя нашага боку рабіла «напад» на адзін з буйных гарадоў, які знаходзіцца ў тылу нашага «праціўніка».

Працоўныя Менску павінны яшчэ больш узмацніць работу па падрыхтоўцы СПА, павінны дабіцца таго, каб усе прадпрыемствы, каб кожны рабочы безагаворачна падпарадкаваліся-б усім патрабаваньням, якія да іх прад'яўляюцца ў часе манэўраў органамі ўлады.

Больш дысцыпліны, больш пільнасьці! Быць па-ранейшаму напагатове!

АБВЕСТКА

З прычыны невыкананьня распараджэньня штабу п

ЧЫГУНАЧНЫ ТРАНСПАРТ

У ГОМЕЛЬСКІМ ДЭПО

ня ведаюць сваіх ударнікаў

Пераважнае забесьпячэньне лепшых ударнікаў пастаўлена нездавальняюча

САМАЦЁК У КУЛЬТМАСАВАЙ І БЫТАВОЙ РАБОЦЕ ПРЫВОДЗІЦЬ ДА ЧАСТЫХ ЗДАРЭНЬНЯЎ І ПРАРЫВАЎ

Гомельскі вузел — адзін з лепшых у БССР. **На выкананьні 7 асноўных вымяральнікаў Гомель стаіць на першым месцы.** Калі прыняць за 100 кожны з гэтых вымяральнікаў, дык агульны процант выкананьня трансфінпляну пры недавыкананьні асобных паказальнікаў складае 716 проц. у той час, як Аршанскі вузел дае толькі 629 проц.

Пры большай мабілізацыі актыўнасьці рабочай масы і выкарыстаньні яе ініцыятывы можна было-б дабіцца ня толькі замацаваньня гэтых посьпехаў, але і аначнага перавыкананьня трансфінпляну. Аднак, **культурна-масавая і бытавая работа — найбольш слабое зьвяно ў гомельскіх чыгуначных арганізацыях.**

Возьмем ударніцтва. Па вузьле выдана 385 картак ударнікаў. Ці ведае рабочая маса лепшых рабочых? Не. У клюбе, дэпо, мясцкомах, нідзе вы ня знойдзеце прозьвішча, партрэтаў лепшых ударнікаў. За тое прозьвішчы прагульшчыкаў, гультаёў, рвачоў вывешваюць хутка. Наколькі недаацэньваецца важнасьць папулярызацыі ўдарнікаў, вынаходцаў — сьведчыць выступленьне старшыні МК 6, тав. **Ляшко,** які заявіў на прэзыдыуме райпрафсачу: «Нельга-ж вывешваць прозьвішча ўдарніка, каб ён мазоліў вочы ўсім і кожнаму».

Усе чорныя і чырвоныя дошкі ў майстэрнях ашыты абвесткамі, а ў старым дэпо ў такарным цэху на **чорную** дошку ўмудрыліся нават вывесіць трыкутнік, ударнікаў і ілжэ-ўдарнікаў — усіх разам. Такое-ж становішча на паравоза-рамонтным заводзе імя Ланцуцката. Па ўсім заводзе ня відаць ніводнага прозьвішча ўдарніка, **нават таго, які быў прэміраваны заграничнай паездкай на цеплаходзе «Украіна».** Зразумела, што пры такой папулярызацыі лепшых змагароў са сацыялізм, новы рабочы, які прыходзіць на транспарт, ня ведае, па кім раўняцца, ня ведае лепшых перадавікоў.

Транспартная кампэрацыя да апошняга часу сваёй работай ня спрыяла разгортваньню ўдарніцтва і праводзіла ў забесьпячэньні прынцыпы ураўнілаўкі. Праўда, ударнікам выдавалася сёе-тое з дэфіцытных тавараў, але **штодзённага папапшэньня абслугоўваньня ня было.** І толькі калі аб гэтым было рашуча пастаўлена пытаньне ў транспартным спажывецкім таварыстве, знайшліся фонды і магчымасьць лепш паставіць грамадзкае харчаваньне ўдарнікаў.

Яшчэ характэрны факт. МК цягі падаў у райпрафсач для прэміраваньня сьпіс 400 ударнікаў. Калі запатрабавалі даказаць, за што яны ўнесены ў сьпіс лепшых і за што яны павінны быць прэміраваны, МК змог даць характарыстыку толькі 44 сапраўдным ударнікам, якія і былі прэміраваны. Замест таго, каб растлумачыць рабочым, чаму былі прэміраваны толькі 44, работнікі МК цягі і цэхкамітэту заявілі ім: «Па раскладцы далі мала картак».

Гомельскі чыгуначны клюб па сваіх памерах і абсталяваньні — лепшы ў Беларусі. Над клюбам вісіць вялікі плякат з надпісам: «Усе сілы на выкананьне трансфінпляну». Як-жа клюб рэалізуе гэты лёзунг? Ні ў адным са шматлікіх памяшканьняў клюбу нельга знайсьці надпісу, які гаварыў-бы аб задачах рэканструкцыі транспарту. Плякаты «Як мы працуем», вывешаныя ў кутку ўдарніка і габінэце ІТР, запоўнены данымі толькі за красавік. У бібліятэцы ёсьць тысячы кніг, але няма літаратуры аб вытворчасьці, аб барацьбе за вымяральнікі. Кіно таксама не выкарыстоўваецца для папулярызацыі лепшых прыкладаў работы, ударнікаў і вынаходцаў.

Вынікі гаспадарчага разрахунку ёсьць, але рабочыя аб іх ня ведаюць. **9-га верасьня** на вытворчай нарадзе паравозных брыгад памочнік начальніка дэпо па масавай рабоце тав. **Паполаў** выступіў з дакладам аб вынніках гаспадарчага разрахунку за... **чэрвень.** А старшыня МК 2 тав. **Карпенка** прымушаны быў заявіць: «Тры месяцы б-ежа і ніяк улічку ня можам наладзіць. У канцылярыі дэпо надзвычайная блытаніна, справа з улікам усё пагоршваецца». У спрачках амаль усе ўдарнікі гаварылі аб тым, што **яны ня ведаюць вынікаў сваёй работы.**

Некалькі слоў аб ураўнілаўцы. На Гомельскім вузьле элементы ураўнілаўкі ў зарыначе далёка яшчэ ня ажыццёўлены. Адбіршчыцы паравозаў ступенчатага дэпо мелі прыработку 137 проц., а акіпажная брыгада, міжцыкліковага рамонту гэтага-ж дэпо мае максымум 30 проц. прыработку. Гаспадарчая брыгада атрымлівае сярэдні прыработак па дэпо, а брыгада вадазабесьпячэньня — 35 проц. поправачнага каэфіцыенту. У выніку рабочы 3-га разраду брыгады вадазабесьпячэньня зарабляе столькі-ж колькі рабочы 6-га разраду гаспадарчай брыгады.

Самацёк у пастаноўцы і перабудове масавай работы прывёў да аслабленьня ўвагі да вытворчасьці з боку некаторых адсталых рабочых і росту здарэньняў. У першай дэкадзе верасьня на Гомельскім вузьле ў выніку сутычкі выбылі са строю 3 паравозы.

У запіўні гомельскія рабочыя дасягнулі блёкучых вынікаў у абточцы паравозаў. Замест 12 дзён паравоз прастаяў тры дні. Гэты посьпех, аднак, не замацаваны. **За 12 дзён верасьня выпушчаны з абточкі толькі два паравозы.** Вінавата ў значнай ступені адміністрацыя, якая да пастаноўкі паравоза ў абточку ня цікавіцца становішчам паравоза па кнізе запісаў і толькі калі паравоз падняты і вынятаны скаты, зжаёміцца з рамонтам. Адсюль бясплянавая перагрузка дэталямі дапаможных цэхаў і аднячасовыя прастоі ў іншых цэхах.

Трэба аднаначыць прыкладную работу цэхкамітэту паравозных брыгад, які са жнівуня добра пастаўіў барацьбу са зрывамі спаранай. Кожны вышадак безадкладна рассьледуецца і ў адносінах канкрэтных винаватых прымаюцца неабходныя меры.

Гомельскі райпрафсач ужо зрабіў адпаведныя выводы з усіх гэтых фактаў. Усім МК і цэхкамітэтам прапанавана безадкладна завастрыць увагу на недахопах культурна-масавай і бытавой работы і прыступіць да хутчэйшай яе перабудовы, увязваючы з праверкай гендагавору. Работа кожнай низавой прафарганізацыі будзе аданьвацца ў залежнасьці ад ходу масавай праверкі гендагавору, росту ўдарніцтва, штодзённай інфармацыі аб эфэктыўнасьці і выкананьні ўсіх без выключэньня вымяральнікаў.

М. Б.



Новы паравоз, выпушчаны Сормаўскім заводам да асеньня-зімовых перавозак.

ЗВОДКА

аб выкананьні вымяральнікаў па раёнах ЖБВ і Заходняй чыгунак за першую дэкаду верасьня 1931 г.

	Жлобінскі раён	Гомельскі раён	Аршанскі раён	Віцебскі раён
СЯРЭДНЯ-СУТАЧНЫ ПРАБЕГ ПАСАЖЫРСКАГА ПАРАВОЗА.				
Заданьне	225 клм.	290	250	240
Выканана	241,6 клм.	278,7	249,8	296,9
Процант	107,37 %	96,1	99,92	123,7
СЯРЭДНЯ-СУТАЧНЫ ПРАБЕГ ТАВАРНАГА ПАРАВОЗА.				
Заданьне	186 клм.	191	188	199
Выканана	170,9 клм.	193,4	162,3	175,4
Процант	91,88 %	101,2	86,32	88,1
СЯРЭДНЯ-СУТАЧНЫ ПРАБЕГ ТАВАРНАГА ВАГОНА.				
Заданьне	187,7 клм.	127,5	77	240
Выканана	131,7	175,71	64	193
Процант	102,33 %	138,3	79,22	80,4
ПРОЦАНТ ХВОРЫХ ПАРАВОЗАЎ				
Заданьне	14,54	21,2	13,0	25,13
Выканана	12,27	19,2	12,8	25,13
СЯРЭДНЯ-СУТАЧНАЯ ПАГРУЗКА				
% выкананьня	90,48	72,2	90,67	115
ПРОЦАНТ СЬЛЕДВАНЬНЯ ЦЯГНІКОЎПА РАСКЛАДЗЕ				
Выканала	82,8	92,1	62,1	56,6
Выкананьне	—	87	81,7	60,2

УРАЛМАШЫНСТРОЙ. На здым. Панарама піцэйнага цэху.

МАНЭЎРЫ ЧАСЬЦЕЙ РСЧА

Штандары ўдарніцтва

РАЗЬВЯВАЮЦЦА НАД ПАЛЯМІ МАНЭЎРАЎ

ВЫХОЎВАЕЦЦА ЖАЛЕЗНАЯ ВОЛЯ, ІНІЦЫЯТЫВА І РАШУЧАСЬЦЬ БАЙЦОЎ

Сацспаборніцтва „сініх" і чырвоных

„Мы — на ворагі. У нас агульныя задачы"

РАЁН МАНЭЎРАЎ. (Спэцкор БЕЛТА). Рашаючыя дні манэўраў выклікалі надзвычай вялікую зацікаўленасьць з боку байцоў манэўруючых часьцей. Сацспаборніцтва і ўдарніцкі рух вакол канкрэтных задач манэўраў пашыраюцца з кожным днём.

Байцы-ўдарнікі раду часьцей «сініх» высунулі прапанову арганізаваць спаборніцтва паміж «сінімі» і чырвонымі.

— Мы ня ворагі,—заявілі байцы,—наша агульная задача—мацаваць баявую вывучку арміі пралетарскай дыктатуры.

Палітаддзел «сініх», падтрымліваючы каштоўнае пачынаньне байцоў, выпусьціў спэцыяльную лістоўку да «чырвонай» стараны. Лістоўка будзе распаўсюджана заўтра раніцою самалётам.



На манэўрах ПРЫВА.

Ударныя брыгады імя Т. Т. Варашылава і Гамарніка

РАЁН МАНЭЎРАЎ. НА ПРАЦЯГУ ДВУХ ДЗЁН НЕКАЛЬКІ РАЗ РАЗДАВАЛІСЯ СЫГНАЛЫ ПАВЕТРАНАЙ І ХІМІЧНАЙ ТРЫВОГІ. ДОБРА ПРАЦАВАЛІ АРГАНІЗАВАНЫЯ АСОАВІЯХІМАМ КАМАНДЫ, ПЕРАВАЖНА З ЧЫГУНАЧНІКАЎ.

СЯРОД РАБОЧЫХ-ЧЫГУНАЧНІКАЎ НЯБЫВАЛЫ ЎЗДЫМ. У АДКАЗ НА ПРАГУЛ АДНАГО РАБОЧАГА ЧЫГУНАЧНІКІ АБАВЯЗАЛІСЯ ПРАЦАВАЦЬ ПА-ЎДАРНАМУ, АРГАНІЗАВАЛІ БРЫГАДЫ ІМЯ Т. Т. ВАРАШЫЛАВА І ГАМАРНІКА.

ІНІЦЫЯТЫВА ПА СТВАРЭНЬНІ ТАКІХ БРЫГАД БЫЛА ПАДХОПЛЕНА ІНШЫМІ РАБОЧЫМІ.

ЗА ДВА ДНІ МАНЭЎРАЎ 844 РАБОЧЫЯ АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ І 144 УСТУПІЛІ Ў ПАРТЫЮ.

А.

Зьлёты ўдарнікаў часьцей

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 23. (Спэцкор Белта). Па ўсіх часьцях №-скай стралковай дывізіі адбыліся зьлёты ўдарнікаў. Удзельнікі зьлётаў надзвычай актыўна і ўсебакова абгаварылі вынікі ўдзелу часьцей дывізіі ў другім этапе манэўраў. У прынятых пастановах ударнікі абавязаліся ўзорна правесьці манэўры.

Зьлёты двух стралковых палкоў зьвярнуліся з адозвай да ўсіх байцоў дывізіі, у адозве падкрэсьліваюцца практычныя задачы ўдарнікаў на час далейшых этапаў манэўраў.

ЗАМАЦАВАЦЬ УЗЬНЯТУЮ РАБОТУ

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 21/IX. (БЕЛТА). У раён манэўраў выехалі дзьве агітацыйныя групы ЦК КП(б)Б. Групы маюць з сабой кіно і радыё-перасоўкі для абслугоўваньня насельніцтва. Групы разгарнулі шырокую работу па мабілізацыі ўвагі калгасьнікаў і аднаасобнікаў у справе падрыхтоўкі да сустрэчы Чырвонай арміі, пасьпяховага правядзеньня ёю манэўраў, а таксама па выкананьні палітычна-гаспадарчых задач: своячасовае скончэньне асеньняй сяўбы, арганізацыя чырвоных абозаў, па заготоўках, мабілізацыі сродкаў, вярбоўцы ў калгасы і г. д.

За час сваёй работы групай № 2 ахоплена 10 населеных пунктаў, у якіх распаўсюджана літаратура ТДА-авіяхіму, адозва ЦК КП(б)Б і лёзунгі, праведзены сходы з пастаноўкай кіно-карціц і працаю-перасоўак.

ІНІЦЫЯТЫВА, РАШУЧАСЬЦЬ, ГЕРАІЗМ

Раён манэўраў. Байцы ахоплены баявымі дзеяньнямі разам з тэхнікай. Камандны склад і чырвонаармейцы паказалі ўменьне дзейнічаць разам з іншымі родамі войск.

Камандзір танкавай часьці хутка прыняў рашэньне аб пераправе танкаў праз раку. Камандзір аддзяленьня № палка разабраў са сваім аддзяленьнем батальённую гармату і крыкнуў: „Аддзяленьне за мной" і ў брод перакінуў гармату на другі бераг.

Такіх прыкладаў, якія паказваюць высокую ініцыятыву, рашучасьць і гераізм малодшых камандзіраў і байцоў, было шмат.

Паводле далёка ня поўных даных на працягу другога этапу манэўраў у партыю ўступіла звыш 150 чалавек, у камсамол—100 чал.

МАБІЛІЗАЦЫЯ СРОДКАЎ

5 ДЗЕН ЗАСТАЛОСЯ ДА КАНЦА ТРЭЦЯГА КВАРТАЛУ

Па прыкладу Сіроціна даб'емся перамогі на фінансавым фронце

Дадатковыя ільготы па с.-г. падатку—

сялянам, якія працавалі на лесазагатоўках

НАРКАМФІН БССР, У РАЗЬВІЦЬЦЁ ПАСТАНОВЫ ЦВК І СНК БССР АД 30 ЧЭРВЕНЯ 1931 Г., НАКІРАВАЎ ЦЫРКУЛЯР УСІМ РАЙФА І ГАРФА АБ НАСТУПНЫХ ДАДАТКОВЫХ ІЛЬГОТАХ ПА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫМ ПАДАТКУ СЯЛЯНАМ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ НА ЛЕСАЗАГАТОЎКАХ. ІЛЬГОТЫ ДАЮЦЦА НЕЗАЛЕЖНА АД ТАГО, ЗАКАНТРАКТАВАНЫ ГЭТЫЯ АСОБЫ НА ЗАГАТОЎКІ, ЦІ НЕ.

ЗАРАБОТКІ КАЛГАСЬНІКАЎ, ЯКІЯ АТРЫМАНЫ НА ЛЕСАЗАГАТОЎКАХ, ВЫЗВАЛЯЮЦЦА АД СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАГА ПАДАТКУ 1932 Г.

ЗАРАБОТКІ АДНААСОБНІКАЎ — БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ, ЯКІЯ АТРЫМАНЫ НА ЛЕСАЗАГАТОЎКАХ У 1931 ГОДЗЕ, ВЫЗВАЛЯЮЦЦА АД АБКЛАДАНЬНЯ СЕЛЬГАСПАДАТКАМ У 1932 Г. ПРЫ ЎМОВЕ ВЫКАНАНЬНЯ І ПЕРАВЫКАНЬНЯ ІМІ ЗАДАНЬНЯЎ ПА ЛЕСАЗАГАТОЎКАХ, ЛЕСАВЫВАЗКАХ І ІНШЫХ ЛЯСНЫХ РАБОТАХ У 1931 Г.

ДЛЯ АТРЫМАНЬНЯ ІЛЬГОТ ЗАЦІКАЎЛЕНЫЯ АСОБЫ ПАВІННЫ ПАДАЦЬ У СЕЛЬСАВЕТЫ ДАВЕДКІ З МЕСЦ РАБОТЫ, ПРЫЧЫМ АДНААСОБНІКІ ПАВІННЫ ПАКАЗВАЦЬ У ДАВЕДКАХ СТУПЕНЬ ВЫКАНАНЬНЯ ЗАДАНЬНЯ.

НАРКАМФІН ПРАПАНУЕ ЎСІМ СЕЛЬСАВЕТАМ ПРЫНЯЦЬ ТЭРМІНОВЫЯ МЕРЫ ДЛЯ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ГЭТЫХ ІЛЬГОТ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА.

Спагнана толькі 22,1 проц.

ШКЛОЎ. Кампанія па сельгаспадатку разгортваецца па раёне вельмі марудлымі тэмпамі. На 10 верасьня па аднаасобным сэктары спагнана падатку толькі 22,1 проц.

Райфа і сельсаветы да гэтага часу ня вынялі ўсіх кулацка-заможных гаспадарак для абкладаньня іх у індывідуальным парадку. Яшчэ горш праходзіць паступленьне плацяжоў па страхоўцы. Так, на 10 верасьня паступіла толькі 440 руб. страхавых узносаў.

Асабліва адстаюць у выкананьні фінпляну Таўкачоўскі, Акуневўскі сельсаветы.

Раённыя арганізацыі павінны тэрміново пераключыцца на выкананьне плянаў мабілізацыі сродкаў.

Ян.

Сельсаветчыкі зрываюць сходы па мабілізацыі сродкаў

ПОЛАЦАК. Сельсаветы Полацкага раёну ня разгарнулі рашучай барацьбы за мабілізацыю сродкаў. Ёсьць выпадкі, калі сельсаветы зрываюць сходы па мабілізацыі сродкаў. Так, у Экімаўскім сельсавеце на сход, на які зьявілася цмат сялян, ня прышоў ні адзін прадстаўнік сельсавету, у выніку сход быў сарваны.

Работа па рэалізацыі пазыкі амаль спынена. Ня толькі аднаасобны сэктар, але і некаторыя калгасы не ахоплены падпіскай.

Шустры.

ДА ЗБОРУ САМААБКЛАДАНЬНЯ НЕ ПРЫСТУПІЛІ

КАПЫЛЬ. На ўсіх населіўчах Капыльскага раёну самаабкладаньне праведзена на 100 проц. да с.-г. падатку. Раённыя арганізацыі і сельсаветы, правёўшы сходы на самаабкладаньні, супакоіліся і на гэтым спынілі сваю работу.

Зусім ня была растлумачана пастанова аб тым, што 60 проц. самаабкладаньня павінна паступіць у верасьні, а 40 проц.—да 15-га кастрычніка. Кулацкія гаспадаркі павінны былі ў 7-мідзённы тэрмін пасьля прыняцьця пастановы аб самаабкладаньні ўнесьці поўнасьцю пропшы.

Між тым, з прычыны бязьдзейнасьці сельсаветаў і райфа, на 15 верасьня не паступіла амаль ні аднаго процанту плацяжоў па самаабкладаньні.

П.

Дапамагчы фінансавай эстафэце

ЦП саюзу банкаўскіх работнікаў, у мэтах узмацненьня тэмпаў мабілізацыі сродкаў, праводзіць зараз фінансавую эстафэту.

Эстафэта ставіць сваёй задачай фарсаваць мабілізацыю сродкаў у сельсаветах, павялічыць уклады ў ашчадкасы і скончыць рэалізацыю і афармленьне падпіскі на пазыку «3-ці рашаючы».

Па Менску складзены брыгады, якія прымацаваны да ўсіх фабрык і заводаў. Брыгады разгарнулі растлумачальна-масавую работу на пытаньні прыцягненьня рабочых мас да ўдзелу ў фінансавай эстафэце.

Трэба аднаначыць, што рад прафарганізацый недаацэньвае вялізарнага значэньня эстафэты.

Так, калі да работніка ЦП саюзу рабочых МТС тав. Зайцава зьвярнуліся з просьбай вылучыць людзей у брыгады фінэстафэты, Зайцаў адказаў:

«Скончэньне сяўбы ў нас больш важная справа, чым мабілізацыя сродкаў. Таму людзей ні на якую эстафэту мы не дамо».

Амаль такі-ж адказ быў атрыманы і ў ЦП саюзу кампэрацыйных работнікаў.

Адмаўляюцца ад вылучэньня людзей для ўдзелу ў фінансавай эстафэце і рад кіраўнікоў дзяржаўных устаноў. Так, дырэктар Менскага аддзяленьня Дзяржбанку т. Кэйлін заяўляе: «ніводнага чалавека для пасылкі на вёску я ня дам»! Неабходна дабіцца належнай увагі да фінансавай эстафэты. Рабочая грамадзкасьць павінна дапамагчы ЦП саюзу банкаўскіх работнікаў у ліквідацыі прарываў у фінпляне.

Штурмавыя брыгады кінуты на вёску

ВУШАЧЫ. Выкананьне плянаў мабілізацыі сродкаў па раёне праходзіць вельмі нездавальняюча. Трэці квартал ужо канчаецца, між тым плян па раёне выкананы толькі на 25 проц.

Асабліва дрэнна праходзіць рэалізацыя пазыкі «Трэці рашаючы». На сёнешні дзень плян рэалізацыі пазыкі выкананы толькі на 50 проц.

Прарывы ў выкананьні фінпляну—вынік бязьдзейнасьці раённай камісіі садзейнасьці і крэдытна-фінансавых устаноў. Раённая камісія садзейнасьці зусім спыніла сваю работу.

Дрэнна стаіць справа з мабілізацыяй сродкаў па лініі спажывецкай кампэрацыі. Гарбацкае, Гарадзецкае, Весьвіцкае і Глінскае сельспажыўтаварыствы выканалі свае пляны па мабілізацыі сродкаў толькі на 40-50 проц.

Для ліквідацыі прарываў раённымі арганізацыямі абвешчан дэкаднік штурму. У сельсаветы накіраваны брыгады з раённага партактыву. Па сельсаветах ужо разгорнута масавая работа па пытаньні мабілізацыі сродкаў. У ЗАРАДЧАНСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ АРГАНІЗАВАНА 11 ШТУРМАВЫХ БРЫГАД, ЯКІЯ ПРАВОДЗЯЦЬ ЗБОР АБАВЯЗКОВЫХ І ДОБРААХВОТНЫХ ПЛАЦЯЖОЎ, ПРОДАЖ АБЛІГАЦЫЙ ПАЗЫКІ І АКЦЫЙ ТРАКТАРАЦЭНТРУ.

У выніку разгорнутай работы гэты сельсавет ужо перавыканаў плян збору падатку першай раты.

Ян Ліпаўка.

АБЯЗЬЛІЧКА У ВЫКАНАНЬНІ ФІНПЛЯНУ

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Мабілізацыя сродкаў па раёне праходзіць нездавальняюча. Не ліквідавана абязьлічка ў выкананьні фінпляну. Так, у той час, як пляны па сельгаспадатку выкананы на 114 проц., жыльлёвы збор—на 104,5 проц., культэбор—на 381 проц. і г. д., ёсьць прарыў у зборы іншых планяжоў, асабліва абавязковых. Так, плян рэалізацыі акцый Трактарацэнтру выканан толькі на 4,8 проц., рэалізацыі абавязцельстваў па сельгасмэтынах—на 1.1 проц., паянжаваленьня і ўступных узносаў—на 10 проц.

Спажывецкая кампэрацыя ня прымае рашучых мер да паскораньня тавараабароту. Ёсьць прарывы і ў ліквідацыі запазычанасьці ў жылкаапэрацыі (не сабрана 104 тыс. руб.).

РайКК, заслухаўшы даклад аб мабілізацыі сродкаў па раёне, вынесла рад практычных прапаноў і ўсклала партыйныя спагнаньні на работнікаў, якія зрывалі выкананьне фінпляну.

Мерскі.

Сена гніе

БРАГІН. (Па тэлефону).

На прыстані **БАБКІ** ляжыць пад адкрытым небам і псуецца 360 тон сена. Брагінскі райкаапсаюз бюракратычна запятвае адгрузку сена па прызначэньні. Тут-жа псуецца пад адкрытым небам 7 тон капусты і інш. гародніны. Гомельскі ЦРК не прысылае тары для ўпакоўкі гародніны. Патрэбны рашучыя меры.

Брыгада «Зьвязды».

Сіласаваньне сарвана

У Дарагаваўскім сельсавеце, Стара-Дароскага раёну, сіласаваньне сарвана. У большасьці калгасаў яшчэ ня скончана сіласнае будаўніцтва. У калгасе **«ЧЫРВОНЫ БАЕЦ»** ямы толькі пачалі капаць. У калгасе **«ШЛЯХ ЛЕНІНА»** яму выкапалі даўно, але не абсталявалі. Старшыня калгасу Сталяроў на запытаньне чаму не пабудавана сіласная яма, адказвае: «няма будаўнічых матар'ялаў». Між тым мясцовых будаўнічых матар'ялаў у сельсавеце ёсьць у выстарчальнай колькасьці.

Аднаасобны сэктар датэтуль зусім не засіласаваў нівоўнай тоны. Сельсавет і парт'ячэйка не растлумачылі аднаасобнікам значэньня сіласу. Ні ў адным з населіўчаў ня былі праведзены сходы, прысьвечаныя сіласаваньню.

Дарагаваўскі сельсавет і парт'ячэйка павінны безадкладна мабілізаваць калгасныя масы і аднаасобнікаў на выкананьне пляну сіласаваньня.

Гоцін.

Сьвіньні каля кармушак.

Убраць 500 гэктараў другога ўкосу

Уборка сенажаляў другога ўкосу па калгасах Крупскага раёну яшчэ не пачата ў той час як па раёне належыць убраць 500 га сенажаці.

Толькі адзін калгас «Полымя» (Крупскі сельсавет) убраў і ўжо засіласаваў 75 тон. Іншыя калгасы атаны ня убіраюць.

З боку РВК і райкалгасаюзу ня прынятыя ніякіх мер да тых калгасаў, якія таленбна зрываюць падрыхтоўку кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

А. Вясновы.

Сіласная яма закідана сьмецьцем

У саўтасе **«БОРКАВІЧЫ»**, Дрысенскі раён, да сіласаваньня зусім не прыступілі. Яма, якая яшчэ выкапана ў 1930 годзе, адраз закідана сьмецьцем.

Адміністрацыя глядзіць на такія факты скрозь пальцы, ня прымаючы ніякіх канкрэтных мер.

Лейкіна.

СЛУЧЧЫНА РАЗГАРНУЛА ПАХОД ЗА СІЛАС

СЛУЦАК. (НАШ КАР.). АПОШНЯЯ ДЭКАДА ДАЛА НЕКАТОРЫ ЗРУХ У СПРАВЕ СІЛАСАВАНЬНЯ. ЗА ДЭКАДУ ПРОЦАНТ СІЛАСАВАНЬНЯ ЎЗНЯЎСЯ З 17 ДА 35.

ПАРТЫЯНАЯ І КАМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫІ МАБІЛІЗАВАЛІСЯ НА ПАСЬПЯХОВАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СІЛАСАВАНЬНЯ. РК ЛКСМ ПАСЛАЎ НА ДАПАМОГУ КАЛГАСАМ 45 КАМСАМОЛЬЦАЎ. ПА ЛІНІІ РК КП(б)Б НАКІРАВАНА 30 ЧАЛ. ПАРТАКТЫВ НА СПРАВУ СІЛАСАВАНЬНЯ МАБІЛІЗАВАНА 200 СТУДЭНТАЎ СЛУЦКАГА ПЭДТЭХНІКУМУ, ЯКІЯ ЎЖО ПА МЯСЦАЦЬ ВЫЕХАЛІ Ў КАЛГАСЫ. ФЗВ МЭТАЛІСТАЎ І ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫКАЎ АРГАНІЗУЮЦЬ ВЫХАДЫ ПА ДАПАМОЗЕ ПРЫГАРАДНАМУ КАЛГАСУ «1-Е МАЯ».

ШКОЛА САЎГАСВУЧУ ЗАКЛЮЧЫЛА САЦДАГАВОР З КАЛГАСАМ «ЧЫРВОНЫ МАЯК», ПА ЯКІМ АБАВЯЗАЕЦЦА СВАІМІ СІЛАМІ ЗАСІЛАСАВАЦЬ КАЛГАСУ 300 ТОН КОРМУ І ВЫКАПАЦЬ 4 СІЛАСНЫЯ ЯМЫ НА 200 ТОН.

НАМЕЧАНЫ ЗРУХ ПА СІЛАСАВАНЬНІ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЗАМАЦОВАНЫ ЯШЧЭ БОЛЬШЫМ УЗДЫМАМ КАЛГАСНЫХ МАС, ПЛЯН У 14.596 ТОН СІЛАСУ ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАНАН.

Я. ЖЫЛКА.

КАРМОВУЮ БАЗУ — САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

Запоўніць ямы зялёнай масай

Усю атаву і бульбянік скарыстаць на сілас

ЧАМУ ПУСТУЮЦЬ ЯМЫ

МАЗЫР. Сіласаваньне па Мазырскім раёне знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Па некаторых калгасах сіласныя ямы зусім ня закладзены.

Асабліва адстаюць **Ліпаўскі і Зеляночкі** сельсаветы.

Па Ліпаўскім сельсавеце ні ў адным калгасе і саўгасе не закладзена ні адной сіласнай ямы. У калгасе «Камінтэрн» толькі выкапана яма, а да сіласаваньня не прыступілі. **Атава і бульбянік не скошаны** і не падрыхтаваны для сіласаваньня.

Такое-ж самае становішча і ў саўгасе **«Ліпава».**

Партыйна-камсамольская арганізацыя не мабілізавана на ліквідацыю прарываў у сіласаваньні.

Пякучы.

ПСУЮЦЬ ДРУГІ УКОС

Калгас «Кастрычнік» (Капыльскі раён) мае жывёлагадоўчы ўхіл.

У мінулым годзе ў калгасе адчуваўся востры недахват кармоў. Але вопыт мінулага году праўленьнем ня ўлічан.

Плян сіласаваньня калгасу ў 300 тон палкам сарваны. Меркаваная на пляне сіласная вежа ня будуецца. Будаўніцтва сіласнай траншэі, якое толькі распачалося, праходзіць марудна.

Бульбянік ужо пачаў чарнець. Ня ўбраныя 10 га сенажаці 2-га ўкосу псуюц на коньмі і каровамі.

Прычынай гэтага зьяўляецца дрэнная арганізацыя працы, адсутнасьць сапраўднай ацэнкі дзейнасьці, сацыпаборніцтва і ўдарніцтва паміж калгаснікамі. Працу большасьць калгаснікаў выходзіць у 10 гадзін.

Адсутнасьць пастаянных брыгад і нарадаў для кожнай брыгады прыводзіць да таго, што прыпоўныя на працу калгаснікі па некалькі гадзін трацяць гэтае, каб не атрымаць.

У выніку такой «арганізацыі» калгас з працай не спраўляецца. Плян сіласаваньня ў калгасе «Кастрычнік» можа павінен быць выкананы. Справіцца з гэтай задачай ён зможа толькі перавёўшы ўсю работу на зьвязьлічыну.

ПРАЛЕТАРЫ УСЯГО СЬВЕТУ ВЫСТУПАЮЦЬ

на абарону палоньнікаў Польскага фашызму

СЁНЬНЯ ШОСТЫ ДЗЕНЬ ГАЛАДОЎКІ ПАЛІТВЯЗЬНЯЎ Ў ТУРМАХ ПОЛЬШЧЫ

Недамо ажыцьцявіць крывавыя пляны польскіх Мураўёвых!

Рабочыя Захаду! Разгортвайце чырвоны фронт салідарнасьці з 10.000 зьняволеных рэвалюцыянэраў

Год выданьня—XV
№ 261 (4189)
Пятніца, 25 верасьня 1931
Цана нумару 5 кап.
БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Органа ЦК Мен. Гарому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—6-40, сакратар—10-74, прадсядатар—12-80, прамысл.—13-65, сяв. заказ.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замен. рэдактара—6-19, гарадзкі інфарм.—6-19, замен. рэдактара—6-42, міжнародны інфарм.—6-42, кіраўніцтва выд-ва—10-74, кантора выд-ва—7-81, аддзел рэклямы—7-81

Палітвязьні стойка эмагаюцца

ВАРШАВА, 24. ЯК ПАДАЕ «ІЛЮСТРАВАНЫ КУР'ЕР ЦОДЗЕННЫ» АД 23 ВЕРАСЬНЯ Ў ПАНЯДЗЕЛАК, 20 ГЭТАГА МЕСЯЦА, РАНІЦОЮ ПАЛІТВЯЗЬНІ МЫСЛАВІЦКАЙ ТУРМЫ (МЫСЛАВІЦЫ — ПРАМЫСЛОВЫ ЦЭНТР У ВЕРХНЯЙ СІЛЕЗІІ) НЯ ПРЫНЯЛІ ХАРЧОЎ, ЯКІЯ ІМ ПРЫНЕСЬЛІ, МІСКАМІ ВЫБІЛІ ШЫБЫ, І ВЫКІНУЛІ МІСКІ ПРАЗ ВОКНЫ. А ТОЙ-ЖА САМАЙ ГАДЗІНЕ ПАЧАЛАСЯ ГАЛАДОЎКА Ў КАТАВІЦКАЙ ТУРМЕ (ВЕРХНЯЯ СІЛЕЗІЯ).

ПАЛІТВЯЗЬНІ СТОЙКА ПРАЦЯГВАЮЦЬ ГАЛАДОЎКУ.

Мы, заўсёдык з вамі

Мы, рабочыя, інжынэрна-тэхнічны вэрсанал і служачыя вагона-рамонтнага заводу «Полымя рэвалюцыі», заслухаўшы даклад тав. Цудзіна аб агідных вадзеках над палітвязьняволенымі ў фашыстскай Польшчы, з абурэньнем узьнімаем свой голас пратэсту супроць замаху польскага фашызму на жыцьцё 10.000 рэвалюцыянэраў — палоньнікаў. Польскія фашысты думаюць затаіць крывёю рабочых і рэвалюцыйных сілян надыходзячую сацыялістычную рэвалюцыю. Але гэта ім ня ўдасца.

Мы, рабочыя БССР, ні ў якім выпадку ня можам стадзіцца з тым, што нелёка ад нас, за мяжой, у фашысцкай Польшчы 10.000 палітвязьняў знаходзіцца пад пагрозай сьмерці.

Мы заяўляемся да ўсіх рабочых-чыгуначнікаў БССР і СССР, да рабочых-чыгуначнікаў Польшчы, Нямеччыны і Францыі ўзьняць свой голас пратэсту супроць крывавых учынкаў азьвярэлага фашызму Польшчы. Не давайце затінуць лепшым барацьбітом за справу сусьветнага Кастрычніка.

Толькі салідарнасьць пралетарыяту ўсяго сьвету можа вырваць з лап фашызму жыцьцё 10.000 барацьбітоў рэвалюцыі.

У адказ фашысцкай зграі мы з яшчэ большай напружанасьцю будзем весьці барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за пяцігодку на чыгунцы за тры гады.

Няхай жыве рэвалюцыйная барацьба палітзьняволеных Польшчы!

Памятайце, таварышы, што мы вас не забудзем, што наша думка заўсёды з вамі!

Рэзалюцыя мітынгу рабочых чырвонасьцяжнай гарбарні „Бальшавік"

Заслухаўшы даклад тав. РАК-МАЙЛОЎСКАГА аб становішчы ў польскіх турмах і аб усеагульнай галадоўцы палітзьняволеных, мы—рабочыя, ІТР і служачыя ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАЙ ГАРБАРНІ «БАЛЬШАВІК»—ганьбуем фашысцкі ўрад Польшчы і ШЧЫРА ВІТАЕМ ЗЬНЯВОЛЕНЫХ БРАТОЎ, якія салідарна ўзьнялі сьцяг усеагульнай галадоўкі.

У надзвычай напружанай атмасфэры адбываецца галадоўка 10.000 палітзьняволеных шыбеніц і турмаў.

Ва ўсёй краіне, ня гледзячы на ўвязьненьне ваенна-палявых судоў, узьнімаецца грозная хваля пралетарскай рэвалюцыі. Палітзьняволеныя ўзьняўшы сьцяг барацьбы супроць увязьненьня нога турэмнага рэгляманту, далі бой фашысцкай дыктатуры ў цэлым, далі бой саду шыбеніц і турам.

УСЕАГУЛЬНАЯ ГАЛАДОЎКА—ФРОНТ БАРАЦЬБЫ З ДЫКТАТУРАЙ ФАШЫЗМУ. Заклік да салідарнасьці, які пачуўся-за турэмных крат польскіх Шлісэльбургаў, мабілізуе ў даны момант усіх рэвалюцыйных рабочых і сялян Польшчы. Барацьба палітзьняволеных салідарна падтрымліваецца ўсімі працоўнымі на полькі Польшчы. НАРАСТАЕ БУРА ПРАТЭСТАЎ У САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ І ВА ЎСІМ САВЕЦКІМ САЮЗЕ, НАРАСТАЕ БУРА ПРАТЭСТАЎ ВА ЎСЁЙ ЭЎРОПЕ І АМЭРЫЦЫ.

Няхай ведае польскі фашызм, што барацьба 10.000 рэвалюцыянэраў-палоньнікаў—справа рабочых і сялян усяго сьвету.

Далучаючы свой голас да гэтых шматмільённых пратэстаў працоўных усяго сьвету, мы — рабочыя і работніцы чырвонасьцяжнага «Бальшавіка» зьвяртаемся да рабочых гарбарнай прамысловасьці НЯМЕЧЧЫНЫ: РАЗГОРТВАЙЦЕ ЧЫРВОНЫ ФРОНТ ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ КРЫВАВЫХ НАМЕРАЎ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ. Магутным уздымам міжнароднай пралетарскай салідарнасьці дапаможам зьняволеным братом давесьці барацьбу да пераможнага канца, пакрыжуем крывавыя пляны польскага фашызму.

У адказ фашыстам Польшчы мы заклянем партыю і ўрад, што ў кожную хвіліну гатовы замяніць свае варшаткі на зброю і сьцяной стаць на абарону СССР.

У адказ польскім фашыстам мы абавязваемся перавыканаць прамфінплян трэцяга рашаючага.

Мы ўжо выканалі кантрольную лічбу па дапамозе палітзьняволеным у 1.200 р. і БЯРЭМ НА СЯБЕ АБАВЯЗАК ДАВЕСЬЦІ ЯЕ ДА 2.000 РУБ.

Дарагія таварышы, палоньнікі фашызму!

Мы верым, што блізка тая гадзіна, калі рэвалюцыя зломіць краты вашых турмаў, парве кайданы, у якія закавала вас дыктатура фашызму і пасадзіць на лаву падсудных вашых цяперашніх катаў. У гэтым мы ўпэўнены.

Дык прэч крывавыя рукі ад нашых зьняволеных братоў!

НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМІНТЭРН—АРГАНІЗАТАР СУСЬВЕТНАГА КАСТРЫЧНІКУ!

Масавы рух салідарнасьці ў Эўропе і Амэрыцы

БЭРЛІН, 24. Весткі з Польшчы аб перавозе палітзьняволеных на крымінальны рэжым і зьверскіх зьдзеках польскіх турэмшчыкаў над палітвязьнямі ўскалыхнулі працоўныя масы Эўропы і Амэрыкі.

У БЭРЛІНЕ адбыўся шматлюдны мітынг пратэсту супроць фашысцкага тэрору ў Польшчы. Паліцыя заняла ўсе выхады, абыскваючы ўдзельнікаў. Такія-ж мітынгі адбыліся і ў іншых гарадох НЯМЕЧЧЫНЫ. На сходах прымаюцца рэзалюцыі пратэсту, якія будуць перасланы польскаму ўраду. Нямецкія рэвалюцыйныя арганізацыі зьвярнуліся з адозвай з поваду разгулу тэрору ў Польшчы.

Масавыя сходы пратэсту супроць зьверства польскага фашызму адбыліся ў АЎСТРЫІ: у Вене, Грацэ і Рэйхенбане.

У ПАРЫЖЫ адбыўся грандыёзны мітынг пратэсту, скліканы камуністычнай францыяй парляманту. Масавыя сходы і дэманстрацыі пратэсту, у якіх прынялі ўдзел таксама італьянскія і польскія працоўныя, якія працуюць у Францыі адбыліся ў Рубэ, Дуэ і іншых мясцох. У Дуэ адбылася дэманстрацыя перад будынкам польскага кансульства. ЦК унітарнай канфэдэрацыі працы паслала тэлеграму польскаму пасольству ў Парыжы, патрабуючы спыненьня расправаў над польскімі палітзьняволенымі. У многіх мясцовасьцях адбыліся мітынгі і дэманстрацыі ў абарону польскіх палітзьняволеных. З БАРСЭЛЁНЫ паведамляюць, што гішпанскія працоўныя пратэстуюць супроць прасьледваньняў рэвалюцыйных барацьбітоў у Польшчы.

У ДЭТРОЙЦЕ (ПАЗШ) адбылася 15-тысячная дэманстрацыя пратэсту супроць расправы над польскімі палітзьняволенымі.

Вышэй сьцяг барацьбы палітзьняволеных

У друкарні імя Сталіна адбыўся мітынг пратэсту супроць разгулу польскай турэмшчыны. З дакладам аб усеагульнай галадоўцы выступіў тав. Мятла.

У адказ польскаму фашызму і ў знак салідарнасьці з барацьбой палітзьняволеных, рабочыя друкарні імя Сталіна бяруць на сябе абавязак паглыбіць свае ваенныя веды, павысіць тэмпы барацьбы за прамфінплян, палепшыць работу МОПР'у.

— Няхай ведаюць польскія фашысты, што сусьветны пралетарыят і яго ўдарная брыгада — СССР — не стаіць у баку ад барацьбы 10.000 рэвалюцыянэраў-палоньнікаў.

Вышэй сьцяг барацьбы палітзьняволеных!

ЯПОНСКІЯ ВОЙСКІ ЗАНЯЛІ ЎСЕ ЧЫГУНКІ

Белагвардзейцы заварушыліся

ШАНХАЙ, 23. Мяркуючы па кітайскіх паведамленьнях, японскія войскі відавочна акупавалі ўсе кітайскія чыгункі Паўднёвай Манчжурыі, забясьпечыўшы сабе абсалютны кантроль над гэтымі дарогамі. Буйныя сілы адпраўлены да Таонані і да граніцы ўнутранай Манголіі. У раён Цьзяндао Гірынскай правінцыі паслан дадатковы кавалерыйскі атрад. З тысячы японскіх салдат прыбылі ў Лунцзінцень.

Як паведамляюць, рускія белагвардзейцы ў Манчжурыі спрабуюць выкарыстаць ва ўласных мэтах сучаснае становішча ў Манчжурыі. Атаман Сямёнаў прыбыў у Мукдэн. Як паведамляе агенцтва Гомінь, амэрыканскія і ангельскія кананэркі згуртаваны ў Цінвандао, дзе яны наглядаюць за дзеяньнямі японскіх кананэрак.

Стотысячны мітынг у Нанкіне

ШАНХАЙ, 24. У Нанкіне адбыўся яшчэ адзін грандыёзны мітынг, на якім прымала ўдзел 100 тысяч чалавек. У Шанхаі вуліцы кішаць лятучкамі, транспарантамі і плякатамі з антыяпонскімі лёзунгамі.

Ваенныя апэрацыі ідуць далей

ШАНХАЙ. Нанкінскі міністар па замежных справах накіраваў у Японію ў трэці раз энэргічны пратэст, паўтараючы ранейшыя патрабаваньні, а іменна, неадкладнае адкліканьне войск і ачышчэньне акупаваных тэрыторый. У ноце адзначаецца, што японцы ўсё яшчэ пашыраюць свае ваенныя апэрацыі ў Манчжурыі, ня гледзячы на пратэсты, і што японскія войскі сыстэматычна зьнішчаюць маёмасьць і ўласнасьць прыватных жыхароў.

„Дзень нацыянальнай ганьбы" у Бейпіне

БЭЙПІН, 23 верасьня ў сувязі з падзеямі ў Манчжурыі, у Бэйпіне, Шанхаі і Нанкіне праводзіўся «Дзень нацыянальнай ганьбы». Адбыўся рад мітынгаў пратэсту супроць японскага наступленьня. На вялікім мітынгу ў цэнтральным парку Бэйпіна, пры ўдзеле прадстаўнікоў розных арганізацый была прынята рэзалюцыя, якая патрабавала разрыву зносін з Японіяй і арганізацыяй антыяпонскага байкоту. Адбылася антыяпонская дэманстрацыя вучняў 34-х навучальных устаноў Бэйпіна. Па ўсім Бэйпіне расклеены плякаты з лёзунгамі супроць японскага імпэрыялізму. Прафэсура розных унівэрсытэтаў Бэйпіна і Цяньцзіня зьвярнулася з тэлеграмай да японскай прафэсуры, пратэстуючы супроць японскага наступленьня.

Кулакі... вярбуюцца ў калгас

Койданаўскі раён ва апошні год даўся вялізарных посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. У раёне ў асноўным закончана суцэльная калектывізацыя. Між тым у некаторых партыйных ячэйках Койданаўшчыны не аддаецца належнай увагі арганізацыйна-гаспадарчаму замацаваньню калгасаў. Ня ўсюды пабілізуюцца масы на рашучую барацьбу з кулаком. Так, напрыклад, «кіраўнікі» Макаўчыцкага сельсавету проста дапамагаюць кулаку «урастаць у калгасы». Намесьнік старшыні сельсавету Лісоўскі гаворыць:

«Усё ў маіх руках. Я магу з кулака зрабіць сярэдняка і наадварот». Гэтыя словы Лісоўскі ня кідае на вецер. Ён дапамог свайму сваяку кулаку Гладкаму лесю разбазарыць маемасьць і магонку. Зараз ён ідзе ў калгас «Перамога» пасаду старшыні калгасу займае кулак Васюк, які ў свой час эксплёатаваў беднякоў, і замест таго, каб здаваць ліцкі свайго збожжа дзяржаве, — гнаіў іх. Зараз Васюк кожны дзень п'янствуе і сваімі шкодніцкімі ўчынкамі даводзіць гаспадаркі да развалу. Калі-ж бядняцкі-калгасьніцы Кулікоўская і Гарэлік зрабілі Васюку аб гэтым заўвагу, ён ім адказаў:

— Калі вам не падабаецца, можаце выйсьці з калгасу.

Васюк актыўна вярбуе ў калгас сваю «апору»—такіх-жа кулакоў, як і сам. Па яго ініцыятыве ў гэты-ж калгас прыняты кулакі Ламака, які раней меў 24 гэктары зямлі, і Боўк.

Усё гэта робіцца з санкцыі старшыні сельсавету Пячонкі.

Нядаўна меў месца такі выпадак—калгасьнік Гэлік падаў заяву на Лісоўскага аб тым, што апошні гнаў самагонку. За гэта Гэліка — бытога сярэдняка, а цяпер калгасьніка абклалі ў індывідуальным парадку, забралі карову і сьвіней.

У Гэтым годзе кулацтва Макаўчыцкага сельсавету імкнулася падарваць работу па ўборцы ўраджаю. У выніку гэтага пры бязьдзейнасьці сельсавету і партыйнай ячэйкі саўгасу «Вялікія Навасёлкі» на калгасным полі згніло 60 коп жыта.

У 2-х клм. ад калгасу «Перамога» ў саўгасе «Вялікія Навасёлкі» ёсьць партыйная і камсамольская ячэйкі. Гэтыя арганізацыі зусім не займаліся пытаньнем калектывізацыі і ніяк не рэагуюць на тое, што калгас «Перамога» і нават саўгас засьмечан кулацкімі элемэнтамі.

Характэрна, што на прапанову супрацаўніка «Зьвязды» склікаць сход і абгаварыць на ім пытаньні аб засьмечанасьці саўгасу і калгасу, у ячэйцы і сельсавеце адказвалі:

— Мы ведаем, што нас будуць крыць і таму сход склікаць не патрэбна.

Койданаўскі райком партыі павінен в усёй рашучасьцю ўдарыць па Макаўчыцкіх апартуністах, каб забясьпечыць гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў гэтага сельсавету.

А.

„ЧЫРВ. ЗОРКА" Пач. 7; 8-45; 10-30 — Першы гукавы мастацкі фільм **Пуцёўка ў жыцьцё** драма ў 34 эпізодах.

„КУЛЬТУРА" Пач. у 7; 8-45; 10-30 — Новы мастацкі яўрэйскі фільм **Чалавек з мястэчка**

ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня. — Мастацкая бытавая драма ў 6 частках **ВАСІЛІНА** Звыш праг. хроніка Саюзкіно № 31

„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — **Сапраўдныя паляўнічыя** кіно-фільм у 6 частках. Пач. ў 1 г. і 2 г. 30 м. Каса—з 11 г. дня.

„СПАРТАК" Пач. 7-15, 9 і 10-45 Каса адк. ад 5 г. — БЫТАВЫ ФІЛЬМ **КАФЭ ФАНКОНІ** драма ў 6 частках.

Пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР — АДБУДЗЕЦЦА 25-га верасьня ў 7 гадз. вечара ў памяшканьні ЦК МОПР'у.

Парадак дня:
1) Даклады з месц аб ходзе рэалізацыі пазыкі „3-ці рашаючы" і кампаніі імовай дапамогі (даклядваюць: Чэрвень, Пухавічы, Асіпавічы, Ст. Дарогі). 2) Аб „Рагожным сьцягу", надрукав. у „Інтэрн. Маяку". 3) Укамплектаваньне усебеларускіх курсаў МОПР'у. 4) Аб становішчы Касьцюковіцкай, Клімавіцкай і Горанскай арганізацый МОПР'у.

Пасяджэньне камфракцыі там-жа ў 6 з пал. гадзін.

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў прэзыдыуму і ЦК абавязкова. Г'льба зьявіцца без спазьненьня. Запрашаецца актыў.

Сакратар ЦК МОПР'у БССР
Цудзін.

25 верасьня, у 6 гадз. вечі., у залі пав. Дзяржаўнага ЦСПСБ — АДБУДЗЕЦЦА — Чарговы пленум Бел. МБІТ з наступным парадкам дня: 1) Выніці XI пленуму ЦСПСБ і задачы, што стаяць перад ІТР (дакл. т. Каменштэйн). 2) Арганізацыйныя пытаньні. Запрашаюцца члены рэспубліканскіх і мясцовых бюро ІТС і ўсе ІТР гор. Менску.
Бел МБІТ.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" адкрыта з 12 гадз. дня — СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА НА ЭКРАНЕ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ вытворчасьці Саюзкіно **ЛУНА ЗЬЛЕВА**
Зоя Валоўская
У галоўных ролях: Е. Чуданоў, Е. Ягорава
Крыш праграмы—кіно-хроніка № 46, вытворчасьці Саюзкіно.
Пачатак дзенных сэансаў у 2 г. і 3 г. 30 м.
Пачатак вячэрніх сэансаў у 6 г. 30 м., 8 г., 9 г. 30 м. і 10 г. 40 м.
Каса адкрыта з 12 г. дня
На дзенныя сэансы Цэны зьніжаны

Кошт публікацыі аб згубе дакуманту 1 руб.

Для Беларускай канторы і саўгасаў ТРЭСТУ СЬВІНАВОД ПАТРЭБНЫ:
БУХГАЛЬТАРЫ-ІНСТРУКТАРЫ, СТ. БУХГАЛЬТАРЫ, БУХГАЛЬТАРЫ-КАЛЬКУЛЯТАРЫ РАХУНКАВОДЫ, ЭКАНАМІСТЫ, ЭКАНАМІСТЫ-СТАТЫСТЫКІ, СТАТЫСТЫКІ.
Зварачацца: Менск, Савецкая, 70, СЬВІНАВОД.

Беларускі Дзяржаўны будаўнічы інстытут запрашае студэнтаў, прынятым па асьенным наборы 1931 г., зьявіцца ў інстытут (г. Менск, рог Унівэрсытэцкай і Чырвонаармейскай, 42-6) 30 верасьня ў 6 гадз. раніцы для навучальных заняткаў.
Тыя, што не зьявяцца ў паказаны тэрмін, будуць выключаны з ліку студэнтаў інстытуту.
Занятні на вячэрніх курсах па перакваліфікацыі тэхнікаў у інжынэры пачнуцца кастрычніка г. г. ў 6 гадз. вечара, у памяшк. Будінстытуту.
Дырэктар Будінстытуту ШАЛІМА.

ПРАФІЛЯКТЫКА—АСНОЎНЫ СРОДАК БАРАЦЬБЫ З ЧУМОЙ

ЗАГАД № 138

асобнаўпаўнаважанага Саўнаркому БССР па барацьбе з эпізаотыямі і пытаньні барацьбы з чумой сьвіней

Ад 19 верасьня 1931 году

У выкананьне апошніх дырэктыў партыі і ўраду, зьмешчаных у пастанове ЦК УсеКП(б) і Саўнаркому СССР ад 30 ліпеня 1931 году, і пастанове ЦК КП(б)Б і Саўнаркому БССР ад 22 жніўня 1931 году, аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі, у мэтах ліквідацыі эпізаотыі і ў першую чаргу галоўнага біча сьвінагадоўлі—чумы і зьнішчэньня вялікіх страт, што наносяцца ёю, загадваю:

1. Усім кіраўніком жывёлагадоўчых трэстаў, упаўнаважанаму «ВЭТ», калгаснажывёлагадоўчым аб'яднаньням, дырэктарам саўгасаў, старшыням калгасаў, загадчыкам сьвінагадоўча - гасьпасных фэрм і інш. жывёлагадоўчым арганізацыям арганізаваць рашучую барацьбу з чумой з тым, каб у 1932 годзе чума сьвіней была зусім ліквідавана.

2. Улічваючы распаўсюджваньне чумы і бязумоўную пагрозу ў далейшым паражэньня гаспадарак, прапаную ў абавязковым парадку ва ўсіх саўгасах і сьвінакалгасных фэрмах больш фарсавана праводзіць актыўную імунізацыю ўсяго сьвінога пагалоўя паводле паводле спэцыяльна распрацаванага пляну, які гаспадарчымі арганізацыямі павінен быць прадстаўлен Наркамзему не пазьней 25 верасьня, выходзячы з неабходнасьці закончыць работу па актыўнай імунізацыі стада ў буйных саўгасах і калгасах да 15 лістапада, кіруючыся інструкцыяй Наркамзему СССР і БССР.

3. Выходзячы з вынікаў практычнага правядзеньня актыўнай імунізацыі ў БССР, камісіі ў складзе т.т. Крылова, Пісарава і Валасенкага ў 2-дзенны тэрмін унесьці патрэбныя зьмены і дадаткі да існуючай інструкцыі Наркамзему СССР і падаць мне на зацьвярджэньне.

4. Пэрсанальную адказнасьць за падрыхтоўку і правядзеньне мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць высокую якасьць работы, ускладу на адміністрацыю саўгасаў, калгасаў, вэтдактароў і зоатэхнікаў саўгасаў, старшынь праўленьняў калгасаў, вэтдактароў і зоатэхнікаў райкалгассаюзаў.

5. З мэтай панаўненьня кадраў для правядзеньня паказаных мерапрыемстваў пад пэрсанальную адказнасьць вэтэкстэнтару, упаўнаважанага «ВЭТ» і кіраўнікоў жывёлагадоўчых трэстаў і калгаснажывёлагадоўчых аб'яднаньняў у двухдэкадны тэрмін перападрыхтаваць усіх дактароў сваіх сыстэм шляхам прымацаваньня іх да лепшых начальнікаў атрадаў «ВЭТ» з застаўленьнем іх для далейшай работы ў сваіх раёнах і гаспадарках.

6. Прапаную пад асабістую адказнасьць дырэктароў саўгасаў і старшынь праўленьняў калгасаў і загадчыкаў фэрм — у самы кароткі тэрмін прыстасаваць памяшканьні сьвінарнікаў для правядзеньня актыўнай імунізацыі:

а) тэрмінова скончыць рамонты (даху, сьцен, падлогі, вокнаў, сьтайў, вэнтыляцыі);

б) халодныя сьвінарнікі ўцяпліць (заделка дзірак у сьценах, наладжваньне тамбураў, столі, абкладка знадворку сьцен гноем);

в) забясьпечыць стада сьвіней бесьперабойнай дастаўкай выстарчальнай колькасьці добраякаснай вады з адведнымі кармамі і падсьцілам;

г) забясьпечыць стада сьвіней выгулямі.

7. Патрабую ад вэтэрынарнага пэрсаналу, які праводзіць актыўныя прышчэпкі, высокаякаснай яго работы ў прыватнасьці:

а) адбору стада, якое падлягае актыўнай імунізацыі; рабіць акрамя агульнага клінічнага агляду, двухразовую пагалоўную тэрмамэтрыю;

б) у гаспадарках, паражоных чумой, пасьля правядзеньня актыўных прышчэпак, праводзіць пагалоўную тэрмамэтрыю, пачынаючы з другога дня;

в) пры тэрмамэтраваньні пасьля кожнай сьвіньні абавязкова дэзынфэктаваць тэрмомэтры, а таксама ўтрымліваюць у абсалютнай чыстаце шпрыцы, іголкі і ўвесь іншы інструмэнтары;

г) праверыць на пах і выгляд (гнілы, тухлы пах, вялікія ілоп'і) біяпрапараты, што ўжываюцца;

д) рабіць дасканалую дэзынфэкцыю сьвінарнікаў.

8. Для хутчэйшага правядзеньня паказаных прышчэпак абавязваю старшынь райсаў, саўгасаў і калгасаў і інш. арганізацыі прадстаўлаць вэтэрсаналу, які праводзіць барацьбу з эпізаотыямі, умовы максымальна хуткага і добраякаснага правядзеньня (сваячасовае прадстаўленьне рабочай сілы, адведныя бытавыя ўмовы); прадстаўляць сродкі на перасоўваньні без усякага затрыманьня.

Тав. Аўчыньнікаву, «ВЭТ», пяцідзеўкамі дакладваць мне аб ходзе барацьбы з чумой сьвіней.

9. Пад асабістую адказнасьць тав. Аўчыньнікава, «ВЭТ», Ісаенка і Грузакова ў дэкадны тэрмін укамплектаваць вэтэрсаналам вэтэрынарна-бактэрыялёгічныя установы БССР, у двухдэкадны тэрмін адкрыць занальную станцыю па вывучэньні сьвіных хвароб (у г. Магілеве), укамплектаваць яе вэтэрсаналам, скончыўшы пабудову памяшканьня і разгарнуўшы работу да 1 лістапада 1931 году.

10. Гэтым-жа таварышом у дэкадны тэрмін прыняць рэальныя захады па падрыхтоўцы спэцыялістаў для нізавых вэтэрынарна-бактэрыялёгічных устаноў у патрэбнай колькасьці.

11. У выкананьне пастановы СНКВ ад 25 жніўня г.г. скончыць пабудову ізалятараў і ўсё вэтбудаўніцтва да 1 лістапада 1931 году; ізалятары, якія ёсьць, прывесьці ў належны выгляд для ўтрыманьня хворых сьвіней.

12. Выходзячы з таго, што правільны догляд і ўтрыманьне сьвіней зьяўляюцца асноўным сродкам па ўтрыманьні высокаякасных паказальнікаў работ сьвінасаўгасаў, сьвінакалгасфэрм і што пры правядзеньні актыўнай імунізацыі правільны догляд і ўтрыманьне будуць даваць мінімальны адыход пры добраякасных прышчэпках, — прапаную:

а) дырэктарам саўгасаў і старшыням калгасаў у 10-дзенны тэрмін канчаткова ліквідаваць абзыйчку і дакучасьць сярод рабочых, работнік, тэхнэрсаналу, замацаваўшы за імі пэўныя групы сьвіней і да 1 кастрычніка забясьпечыць перавод на зьдзельна-прэміяльную аплату працы ўсіх работнікаў жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў, сыстэматычна праводзячы прэміяваньне лепшых работнікаў сьвінагадоўчага цэху за захаваньне і лепшую гадоўлю стада;

б) неадкладна забясьпечыць рознастайнымі кармамі, абавязкова ўключаючы і мінэральныя, арганізаваўшы правільнае іх выкарыстаньне;

в) дасканала рабіць клінічны агляд пры кармленьні сьвіней, вылучаючы ўсіх падазроных у захворваньні;

г) у мэтах захаваньня правільнай гадоўлі парасят, зьвярнуць асаблівую ўвагу на гігіенічнае ўтрыманьне іх, на поўнацэннае і рознастайнае рэгулярнае вітамінае і мінэральнае кармленьне і правільны догляд, а таксама на свячасовае вылучэньне захварэўшых і захудалых.

13. У мэтах скарачэньня распаўсюджваньня эпізаотыі чумы, у сувязі з актыўнай імунізацыяй стада саўгасаў і калгасаў, пад асабістую адказнасьць загадчыкаў райсаў, вэтдактароў, якія праводзяць імунізацыю, дырэктароў саўгасаў, старшынь калгасаў і старшынь сельсаветаў праводзіць самае жорсткае карантынаваньне стада калгасаў і саўгасаў, якое імунізуецца, зварачаючыся ў патрэбных выпадках да спэцыяльнай аховы гэтых гаспадарак.

14. Улічваючы, што няправільная практыка ўкамплектаваньня стада сьвіней выклікае эпізаотыі, устанавіць наступны парадак далейшага камплектаваньня:

а) Камплектаваньне, як правіла, павінна ісьці праз першапачатковыя загатоўчыя пункты, або непасрэдна з калгасаў, не дапускаючы прынятую жывёлу на пункты загатоўчых арганізацый, для чаго на месцы загатовак павінны знаходзіцца пастаянныя брыгадзіры саўгасаў і калгасаў;

б) для камплектаваньня стада могуць прымацца толькі яўна здаровыя сьвіньні з абавязковай папярэдняй тэрмамэтрыяй і папярэднім вэтэсанаглядам;

в) у выпадку прыёму сьвіньматак з небясьпечных па эпізаотыі месц, або калі праз іх павінны накіроўвацца сьвіньні ў калгасы і саўгасы, адабраную стаду павінна быць абавязкова зроблена пасьўная прышчэпка супроць чумы;

г) камплектаваньне стада, незалежна з якіх раёнаў яно дастаўляецца, павінна абавязкова вытрымліваць у карантынах, згодна існуючых палажэньняў аб іх.

15. Пад адказнасьць загадчыка райсаў і старшынь сельсаветаў у дэкадны тэрмін правесьці ў жыцьцё пастанову ўраду аб закрыцьці шляхоў, якія праходзяць праз тэрыторыю саўгасаў каля сьвінарнікаў.

16. Пад пэрсанальную адказнасьць дырэктароў саўгасаў, старшынь калгасаў і старшынь сельсаветаў безадкладна арганізаваць даабсталяваньне існуючых скотамагільнікаў і адкрыцьцё новых пры кожным саўгасе, калгасе і населеным пункце, скончыўшы гэту работу да 1 лістапада 1931 г. Скотамагільнікі будаваць воддаль ад населеных пунктаў, абавязкова абгарожваць плотам і канавамі. Трупы закапваць на глыбіні 2-х мэтраў.

17. Ад загадчыкаў райаддзяленьня Саюзскуры патрабую ў дэкадны тэрмін прывесьці ў адпаведнае вэтстановішча паяўныя салатопкі і ўцільустаноўкі:

а) забараняю адкрыцьцё іх у цэнтры населеных пунктаў;

б) прапаную тэрмінова перавесьці паяўныя салатопкі з цэнтру населеных пунктаў за межы іх на адлегласьці ня бліжэй 700-800 мэтр.;

в) паўхільна выконваць усе правілы перавозкі трупаў здохлай жывёлы ў салатопкі, парадак іх утылізацыі, зьнішчэньня адыходаў і санітарнага ўтрыманьня самих салатопак, згодна выданай інструкцыі НКЗВ ад 2 жніўня 1931 г.

Перавозку трупаў рабіць на спэцыяльна прыстасаваных фурманках з дасканалай дэзынфэкцыяй пасьля карыстаньня;

г) салатопкі, якія панава адкрываюцца, як правіла, будаваць на тэрыторыі скотамагільнікаў ці ў непасрэдной блізасьці з імі.

18. Ад кіраўнікоў райаддзяленьня Белмяса і старшынь райсаюзаў і райкаапсаюзу патрабую ў дэкадны тэрмін прывесьці ў адпаведнае санітарнае становішча ўсе жывёлазагонныя базы, прыстасаваўшы асобныя базы і плянцоўкі для сьвіней і асобныя для рагатай жывёлы.

Забясьпечыць гэтыя базы ў 2-хдэкадны тэрмін ізалятарамі для падазроных у інфэкцыйных захворваньнях жывёлы, якая павінна паступаць для камплектаваньня саўгасаў і калгасаў.

19. Пад пэрсанальную адказнасьць загадчыкаў райаддзяленьняў Саюзмяса, старшынь спажыў і райкаапсаюзаў прапаную няўхільна выконваць цыркуляр Наркамзему ад 5 верасьня г.г. № 476, асабліва:

а) не рабіць адпраўкі жывёлы з месц загатовак без папярэдняга вэтэсанагляду і тэрмамэтрыі;

б) ня ставіць жывёлу на базу і не выпускаць загатоўленую жывёлу з базы без папярэдняй тэрмамэтрыі і вэтагляду, у выпадку падазронасьці ў захворваньні заразьлівымі хваробамі ставіць такую ў ізалятар;

в) рабіць абавязковую сыстэматычную мэханічную ачыстку памяшканьняў ад гною, бруду і рабіць дэзынфэкцыю, а ў выпадку зьяўленьня заразьлівых хвароб у кожным паасобным выпадку вытвараць дэзынфэкцыю;

г) забясьпечыць буйныя мясакамбінаты стэралізатарамі для абавязковай стэралізацыі туш ад вымусова забітай жывёлы.

20. Пры перасоўваньні жывёлы па чыгунцы, грунтовым і водным шляхам паўхільна выконваць паказаньні ў цыркуляры НКЗВ ад 5 верасьня г.г. № 467, асабліва:

а) перад пагрузкай жывёлы ў вагоны і пасьля выгрузкі рабіць ачыстку ад гною і дэзынфэкцыю вагонаў, а таксама трымаць у належным вэтэсанстановішчы пагрузачна-разгрузачныя плацоўкі на транспарце;

б) ня прымаць да перавозкі жывёлу на транспарце і водным шляхам без паяўнасьці на кожную партыю жывёлы адпаведных вэтэсанітарных пасьведчаньняў.

21. Кіраўніцтва і адказнасьць за правядзеньне актыўных прышчэпак на БССР ускладу на кіраўніка вэтэсэктару НКЗВ, на ўпаўнаважанага трэсту «ВЭТ» па БССР, загадчыкаў райсаў і ўпаўнаважаных пры сельсаветах. Абавязваю ўпаўнаважанага «ВЭТ» і кіраўнікоў устаноў, кіраўнікоў жывёлагадоўчых трэстаў і аб'яднаньняў прыцягваць асоб, якія зрываюць пасьпяховы ход барацьбы з чумой сьвіней, да жорсткай адміністрацыйнай і судовай адказнасьці.

Прасіць ЦКК-РСІ даць тэрміновую дырэктыву райКК-РСІ ўзяць пад свой штодзенны кантроль ход барацьбы з эпізаотыямі.

22. Агульны нагляд і кантроль за выкананьнем гэтага загаду ўскласьці пэрсанальна на кіраўніка вэтэсэктару НКЗ тав. Грузакова, у раёнах—на загадчыкаў райсаў.

23. Гэты загад апублікаваць у друку, пасласць усім жывёлагадоўчым гаспадаркам, жывёлагадоўчым арганізацыям, сельсаветам і райсаў для выкананьня.

Асобнаўпаўнаважаны СНК БССР па барацьбе з эпізаотыямі і Нарком Зямляробства БССР

РАЧЫЦКІ.

Усебеларуская спартакіяда сацэктару вёскі

З 25 верасьня па 1 кастрычніка на стадыёне ў Менску адбудзецца першая ўсебеларуская спартакіяда сацыялістычнага сэктару вёскі. У спар. БССР.

Спартакіяда будзе праходзіць над знаменем руху ў разьвіцьці фізкультуры на вёсцы.

Удзельнікі спартакіяды навед